№ 45 (499) 8 сьнежня 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

## Лукашэнка мяняе базу

Цяперашні курс краіны падтрымліваюць багатыя і забясьпечаныя. **Старонка 3.**

### Усё гэты Сідорскі...

Януковіч размаўляў зь беларускім прэм’ерам пра неабходнасьць дэмакратычных зьменаў. **Старонка 12.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Мілінкевіч сусьветным лідэрам: выратуйце Казуліна

49-ы дзень галадоўкі Казуліна. Мілінкевіч зьвярнуўся да кіраўнікоў ЗША, Расеі, Нямеччыны, Францыі. **Старонка 7.**

## Сьмерць за сьмерць

У справе банды Марозава пастаўлена кропка. За 16 забойстваў верхаводы групоўкі адкажуць уласнымі жыцьцямі, астатнія атрымаюць вялікія тэрміны зьняволеньня. Вынікі закрытага працэсу — **старонка 8.** Меркаваньні сьвятароў: сьмяротная кара мае права на існаваньне. **Старонка 9.**

## Папулярны рэцэпт

Яшчэ адна галадоўка скончылася перамогай.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Бабулі-каталічкі ў Горадні за шэсьць дзён дабіліся касьцёла для ўнукаў. Старонка 4.**



# у нумары


## люстра дзён

Лукашэнка мяняе базу ........ 3

Ствараецца сыстэма татальнага сачэньня за грамадзянамі ........ 3

Імклівая перамога гарадзенскіх каталікоў ........ 4

Мілінкевіч сусьветным лідэрам: уратуйце Казуліна . 7

Мілінкевіча затрымалі шосты раз ........ 7

Сьмерць за сьмерць ........ 8

Сьвятары: сьмяротная кара мае права на існаваньне ........ 9

Беларуская атамная станцыя паўстане ў Чавусах ........ 10

Мірны атам: меркаваньні разышліся папалам ........ 10

Квасьнеўскі: спыніць ізаляцыю Беларусі ........ 12

Усё гэты Сідорскі… ........ 12

Няма сэнсу ........ 12

Дык ці адраджаюцца пэрсанальныя пэнсіі? ........ 13

Наступнікам Пуціна будзе праваслаўны кагэбіст ........ 13

Хроніка ........ 14

Праваслаўная маральнасьць у школах Гарадзеншчыны ... 18

Менская моладзь растрывожыла слуцкую міліцыю ........ 19

Аб усім патроху ........ 24

## камэнтары

Павал Севярынец. Лісты зь лесу ........ 14

Аляксандар Класкоўскі. Дэмарш Мандэльсона ........ 16

Віталь Тарас. Суцэльныя непрыемнасьці, альбо Антрапалёгія Інтэрнэту ........ 20

## левым вокам

Лёлік Ушкін. Дзяржава для народу ........ 17

## з усіх старон

Фафудзьдзя ........ 22

## культура

Бураўкін сабраў аншляг ........ 23

Дыскаграфія ........ 26

## газэтка дзеткам

Плястыляндыя ........ 27

## вольны час

Дзе варта быць ........ 28

## мы самі

Дзякуй ахвярадаўцам ........ 30

## калі б...

Малюнкі Лёліка Ушкіна ........ 31



МЕХ
СЕТКАВЫ
ДЛЯ ГАРОДНІНЫ
т. 669-25-82


**50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА**

## Тое, што нас яднае

«У подлы час няпроста быць няподлым», — піша Генадзь Бураўкін, вечарына якога сабрала на тыдні аншляг у Палацы мастацтваў (старонка 23). Людзі прыйшлі, хоць да апошняга не было пэўнасьці, ці дазволяць імпрэзу. Увогуле, тыдзень мінуў пад знакам дробных подласьцяў: апаганілі лаву Клінтана ў Курапатах (старонка 14); восем разоў спынялі моладзь, што вандравала па мясьцінах Слуцкага паўстаньня (старонка 19); запэцкалі Мілінкевічу фарбай машыну (старонка 7). Пайшлі сыгналы, што сацыяльным работнікам загадана сачыць за палітычнымі настроямі пэнсіянэраў (старонка 3). Прычына ясная: сацыёлягі дыягнастуюць старэньне рэжыму. Яго пачынаюць падтрымліваць пераважна тыя, «каму жыць добра» (старонка 3).

І зь іншага боку, досьвед гарадзенскіх каталікоў, якія шасьцідзённай галадоўкай дабіліся таго, чаго дзесяць гадоў не маглі дамагчыся звычайным шляхам (старонка 4), пацьвердзіў даведзенае ўжо пратэстантамі з «Новага жыцьця», віцебскімі прадпрымальнікамі. Дзяржава любым спосабам унікае публічных канфліктаў з грамадзянамі па-за палітычным полем.

Галадоўкі усё часьцей называюць «апошнім эфэктыўным сродкам» у адстойваньні правоў асобы перад дзяржавай. Дыктатура — гэта сутыкненьне з уладай адзін на адзін, без амартызатараў у выглядзе грамадзкіх арганізацый, судоў, закону ўрэшце. І сьмеласьць асобы будзе стрымліваць дзяржаву, пакуль іх канфлікт мае розгалас. То бок, пакуль існуюць незалежныя СМІ.

Тут хаваецца адказ на пытаньне: ці ня варта, зважаючы на ўціск, немагчымасьць распаўсюджвацца, а часта і друкавацца, ператварыць газэты ў «баявыя лісткі», выходзіць падпольна і займацца контрагітацыяй? Ня варта. «Ня будзем пісаць громка. Будзем спакойне, цьвёрда кідаць усім праўду ў вочы, пастараемся быць цярплівымі і панаваць над сабою: няхай халодны розум моцна трымае ў руках гарачае сэрца». Крэда, прагалошанае заснавальнікамі «Нашай Нівы» сто гадоў таму, актуальнае дагэтуль. Актуальным застаўся і іх заклік да чытачоў: падтрымлівайце нас! Работа працягваецца.

**Андрэй Скурко**

### Да ўвагі чытачоў

З 1 сьнежня галоўным рэдактарам газэты «Наша Ніва» стаў Андрэй Скурко. А.Скурко нарадзіўся ў 1978 у мястэчку Крывічы на Мядзельшчыне. Ён скончыў беларускую філялёгію БДУ. Аўтар «Нашай Нівы» ад 1998, ад 2000-га – намесьнік галоўнага рэдактара. У 2006 годзе быў абраны намесьнікам старшыні Беларускага ПЭН-Цэнтру.

# Лукашэнка мяняе базу

Цяперашні курс краіны пачынаюць падтрымліваць багатыя і забясьпечаныя.

Дасьледчы цэнтар Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту быў правёў апытаньне, каб высьветліць стаўленьне беларусаў да каштоўнасьцяў рынкавай эканомікі. Рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на цэлы шэраг пытаньняў, зьвязаных з гэтай тэмай. Некаторыя вынікі даюць прастору для значных роздумаў.

Вельмі паказальным зьяўляецца пытаньне аб сярэдніх заробках насельніцтва: 25% атрымліваюць менш за 100 даляраў, 32% — ад 100 да 150 даляраў, па 22% — ад 150 да 200 даляраў і 21% — звыш 200.

Найбольш забясьпечанымі зьяўляюцца жыхары Менску і буйных гарадоў. Толькі траціна апытаных могуць дазволіць сабе якасную ежу і вопратку. Разам з тым 40% можа набыць сабе патрыманы ці новы аўтамабіль, а кватэру ў стане набыць 12% насельніцтва.

Чвэрць насельніцтва апроч асноўнай працы мае яшчэ і падпрацоўкі. Адпаведна вынікам апытаньня, найбольш мабільнымі і актыўнымі, што датычыць падпрацовак, зьяўляюцца вайскоўцы і міліцыянты, а таксама мэнэджэры сярэдняга і вышэйшага зьвяна.

40% апытаных кажуць, што не адчуваюць нічога новага ў цяперашняй эканамічнай сытуацыі, чвэрць кажа пра тое, што даводзіцца «круціцца», каб забясьпечыць родным годнае жыцьцё, 17,8% выкарыстоўваюць сытуацыю, каб дабіцца ў жыцьці большага. Толькі 4,3% ніяк ня могуць прыстасавацца да сёньняшніх рэаліяў.

Жыхары вёсак і малых раённых гарадкоў лічаць, што бліжэйшым часам іхняе жыцьцё ніякім чынам ня зьменіцца. Тое ж думаюць і менчукі. Затое насельнікі буйных і абласных гарадоў лічаць, што іх чакаюць зьмены да лепшага. Да горшага ва ўсіх населеных пунктах рыхтуюцца ад 5,5 да 9,5% насельнікаў. Трэба адзначыць, што апытаньне праводзілася ў ліпені, таму насельніцтва не адрэагавала на магчымае павышэньне цэн на газ.

Што цікава, беларусаў больш за эканамічныя праблемы хвалююць сацыяльныя накшталт п’янства.

Людзі старэйшага веку найперш думаюць, што эканамічнае становішча ў краінах Балтыі горшае за беларускае, моладзь, у сваю чаргу, мае адваротнае меркаваньне.

Жыхары Менску лічаць найбольш эфэктыўнай эўрапейскую мадэль эканамічнага разьвіцьця, а вось насельнікі вёсак, раённых і абласных гарадоў выказваюцца за такі тып, які існуе цяпер у Беларусі, называючы яго найбольш эфэктыўным.

Вера насельніцтва ў тое, што ў краіне праводзяцца рынкавыя рэформы, залежыць ад заробку апытаных. Чым ніжэйшы заробак, тым большая вера і наадварот. 81% насельнікаў лічаць, што Беларусі неабходныя рынкавыя пераўтварэньні

Абсалютная большасьць рэспандэнтаў незалежна ад заробку лічаць, што за апошнія гады Беларусь дасягнула больншых посьпехаў у эканамічнай сфэры, чым суседнія краіны.

Толькі 31% рэспандэнтаў лічаць, што Беларусь і Расея мусяць стварыць саюзную дзяржаву з адной валютай, парлямэнтам і прэзыдэнтам, яшчэ менш — 29% — выказваюцца за тое, каб Беларусь увайшла ў склад Расеі. Разам з тым 55% апытаных выказваюцца за тое, каб Беларусь увайшла ў Эўрасаюз, але столькі сама рэспандэнтаў лічаць, што ўрады заходніх краінаў перашкаджаюць разьвіцьцю беларускай эканомікі.

Прыхільнікаў пераменаў найбольш сярод прадстаўнікоў маладога і сярэдняга пакаленьняў — да траціны. Цікава, што найбяднейшыя пласты насельніцтва зьяўляюцца прыхільнікамі рынкавых рэформаў ці цясьнейшай інтэграцыі з Расеяй, а найбацейшыя падтрымліваюць цяперашні курс краіны, але выступаюць супраць інтэграцыі з Расеяй. Такім чынам адбываецца зьмена асноўнай электаральнай базы дзейнага прэзыдэнта.

Навінам тэлебачаньня і іншых дзяржаўных СМІ найперш давяраюць у невялікіх населеных пунктах, з павелічэньнем колькасьці насельніцтва ў горадзе павышаецца адпаведна і давер да Інтэрнэту ды незалежных выданьняў.

Толькі кожны пяты рэспандэнт штодня карыстаецца Інтэрнэтам. 48% ім увогуле не карыстаюцца, а 17% ня ведаюць, што гэта такое.

**Зьміцер Панкавец**

# Ствараецца сыстэма татальнага сачэньня за грамадзянамі

У Сьветлагорскім раёне працоўныя сацыяльнай службы атрымалі распараджэньне *штодня ад 13 да 15 гадзіны* паведамляць сваёй начальніцы пра стан здароўя падапечных пэнсіянераў, а таксама іхні *палітычны настрой і тыповыя выказваньні*.

Таксама і РАА даслаў па школах паперу, дзе дырэктаркі мусяць *штодня* паведамляць пра грубыя парушэньні працоўнай дысцыпліны работнікамі, а таксама палітычную інфармацыю.

*Штомесячна яны мусяць здаваць абагульнёную інфармацыю.*

Пракамэнтуйце, калі ласка, гэта публічна, бо, несумненна, у Вас ёсьць і ад іншых чытачоў такая інфармацыя.

**Мікола Бусел, Дуброва, Сьветлагорскі раён**

Камэнтар Рэдакцыі. Аналягічная інфармацыя надыходзіць і зь іншых рэгіёнаў. Гэтак, у часы наяўнасьці незалежных выданьняў у каталёгу «Белпошты» зьвесткі пра іх падпісчыкаў пошты адпраўлялі ў органы ўлады. Некалькі дзеячаў інтэлігенцыі і грамадзкіх актывістаў з рэгіёнаў паведамілі, што да іхных суседзяў зьвярталіся з просьбамі разьмясьціць у іхных кватэрах «жучкі» для праслухоўваньня. Шэраг грамадзкіх дзеячаў рэгулярна абшукваюць на мяжы. Пра што гэта сьведчыць? Пра тое, што ўлада сьпешна выбудоўвае сыстэму татальнага кантролю за грамадзтвам і стварыла «чорныя сьпісы» палітычна нядобранадзейных. Рэпрэсаваць — час ня той, але запалохваць людзей, замінаць у іхным прасоўваньні будуць. Гэта таксама паказвае, да чаго насамрэч рыхтуюцца ўлады, на словах гаворачы пра «эвалюцыю да дэмакратыі» і «дзяржаву для народу».

Усе процізаконныя дзеяньні калісьці атрымаюць належную ацэнку. Вось як у сераду прыйшла інфармацыя з Баўгарыі, што й там ужо раскрываюцца дасье былога баўгарскага аналягу КГБ, а былым сакрэтным інфарматарам будзе закрытая дарога на адказныя пасады.

Раім усякую інфармацыю на гэтую тэму дасылаць беларускім і міжнародным праваабаронцам і ў місію АБСЭ ў Беларусі.

# Імклівая перамога гарадзенскіх каталікоў

У Горадні на шостыя суткі спынілася галадоўка–пост пробашча і верніц парафіі Найсьвяцейшай Панны Марыі, Маці міласэрнасьці. Пасьля таго як галадоўнікаў падтрымаў біскуп Кашкевіч, старшыня аблвыканкаму сьпешна падпісаў дазвол, зь якім марудзіў дзесяць гадоў.

Акцыя пратэсту пачалася 1 сьнежня, калі галадоўку абвясьцілі айцец Аляксандар Шэмет і 12 парафіянак. Ад поўначы 1 сьнежня яны адмовіліся ад ужываньня ежы. Галадоўка праходзіць у драўлянай капліцы, дзе штодня зьбіраюцца на набажэнствы вернікі. Галадоўнікі дамагаліся, каб гарадзкія ўлады далі пісьмовы дазвол на пабудову храму, якога парафіяне ня могуць атрымаць дзесяць гадоў. Найстарэйшая ўдзельніца галадоўкі мела 79 гадоў.

Айцец Шэмет кажа: «Першапачаткова думаў, што гэтую акцыю падтрымаюць толькі чацьвёра парафіянак, але пасьля ранішняй імшы ўбачыў, што верніц засталося нашмат болей. Я запытаўся, ці засталіся яны памаліцца, ці зь якой іншай патрэбы. Адказалі, што таксама будуць пасьціцца. Казаў, што старэйшыя людзі няхай прытрымаюцца тры дні, іншыя пяць, а я, як маладзейшы, буду галадаць болей, колькі Бог дазволіць».

Спачатку гаварылася пра тое, што вернікі будуць знаходзіцца ў капліцы толькі днём, а на ноч вяртацца дадому, але галадоўніцы прынялі рашэньне заставацца ўвесь час унутры збудаваньня. Коўдры і падушкі ўдзельніц галадоўкі-посту былі разьмешчаныя проста вакол алтара.

«У пятніцу раніцай прыходзіў да нас нейкі «гэбіст», штодня ля капліцы дзяжурыць нейкая машына, — гаворыць Аляксандар Шэмет.

**Працяг на старонцы 6.**

**Айцец Аляксандар Шэмет**

нарадзіўся 9 красавіка 1961 у вёсцы Люсіна (Ганцавіцкі раён). Там жа скончыў школу. Пасьля вучыўся на кухара ў Баранавічах. Працаваў у санаторыі «Нарач». У 1982 паступае ў Рыскую духоўную сэмінарыю, сканчае яе ў 1987. У гэтым жа годзе працуе вікарыем у Рызе і Даўгапілсе. З 1988 сьвятарствуе ў Беларусі, у вёсках Адамавічы і Сіліванаўцы (Гарадзенскі раён). У 1992–1994 вучыўся ў Папскім унівэрсытэце ў Рыме. З 1994 па 1996 працягвае працу ў Сіліванаўцах. Ад 1998 айцец Шэмет узначаліў парафію Найсьвяцейшай Панны Марыі Вастрабрамскай, Маці міласэрнасьці, дзе і сьвятарствуе да сёньня.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ




**Галадоўніцы начавалі проста ў капліцы ля алтара.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Імклівая перамога гарадзенскіх каталікоў

Працяг са старонкі 4.

— Прыходзіла журналістка зь мясцовай газэты «Перспектива», пыталася, нашто я даю зьвесткі пра галадоўку апазыцыйным выданьням. Адказваю, што для мяне няма розьніцы між дзяржаўнымі і недзяржаўнымі, а адказваю тым, хто выказвае цікавасьць да нашага пратэсту. Я не раблю з галадоўкі палітычную акцыю, і журналісты, дзякуй ім за гэта, усё разумеюць».

Цягам выходных кепска зрабілася дзьвюм верніцам. Уначы на панядзелак гіпэртанічны крыз здарыўся з 68-гадовай Тарэзай Мілашэўскай, яе забрала дадому дачка, якая жыве каля капліцы. Спадарыня Мілашэўская была вымушаная перапыніць сваю галадоўку. Хуткая дапамога таксама прыяжджала да 71-гадовай Ірэны Гілюк, але апошняя засталася з удзельнікамі посту.

У нядзелю галадоўнікаў наведаў біскуп гарадзенскай япархіі Аляксандар Кашкевіч разам зь іншымі сьвятарамі з Горадні, Ліды ды іншых местаў. Біскуп Кашкевіч выступіў зь невялічкай прамовай перад імшой, дзе адзначыў, што ён разам зь вернікамі ў іхнім змаганьні за справядлівасьць.

Айцец Шэмет кажа, што не чакаў візыту такога высокага госьця. «Для мяне гэта была надзвычай прыемная нечаканасьць, — кажа сьвятар. — Біскуп блаславіў нас у нашай справе, а пасьля прыватна запытаўся, чаму я не прыйшоў напярэдадні галадоўкі-посту ў курыю, калі мяне выклікалі. Адказаў шчыра, што забаяўся, забаяўся таго, што акцыя ня будзе падтрыманая».

У галадоўцы-посьце ня ўдзельнічаў ніводны мужчына. «Яны ўсе баяцца, — кажа айцец Шэмет. — Пасьля, канечне, ім будзе сорамна перад гэтымі сьвятымі жанчынамі, што галадалі не яны, але цяпер ахвотных далучыцца да нас мужчынаў няма».

Таксама былі візыты ад прадстаўнікоў Саюзу палякаў, што ўзначальвае Анжаліка Борыс, прыяжджаў польскі консул. Зь Менску ў Горадню завіталі Ўладзімер Мацкевіч і Дзяніс Гіль, якія бралі ўдзел у галадоўцы-посьце вернікаў царквы «Новае жыцьцё». Уладзімер Мацкевіч кажа: «У гарадзенцаў больш сьціплыя і аскетычныя ўмовы, чым былі ў нас. Нас вельмі цёпла прынялі, мы расказалі пра ўласную галадоўку. Гэтыя бабулькі пакінулі на нас вельмі моцнае ўражаньне, шкада толькі, што сярод удзельнікаў няма моладзі і мужчынаў. Відаць, гэтыя бабулькі больш моцныя ў сваёй веры».

У аўторак капліцу наведаў прадстаўнік рады па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Гарадзенскага аблвыканкаму Ігар Папоў. «Ён прынёс дакумэнт, які дазваляў нам будаўніцтва касьцёлу, але мы адмовіліся яго прыняць, бо ён быў напісаны на імя сьвецкага чалавека. Я сказаў, што ліст мусіць быць накіраваны асабіста біскупу, — кажа а.Аляксандар. — У сераду 6 сьнежня да нас у капліцу прыехаў біскуп Кашкевіч, які прывёз афіцыйны дакумэнт за подпісам старшыні Гарадзенскага аблвыканкаму Ўладзімера Саўчанкі, які дазваляе нам будоўлю. Трымаць далей галадоўку ня мае сэнсу, мы дамагліся свайго. Біскуп Кашкевіч падзякаваў жанчынам, што ўдзельнічалі ў пратэсьце, за іхнюю веру. Цяпер жанчыны плачуць і моляцца, яны вельмі задаволеныя, што галадалі не дарма».

Гэта ўжо чацьвёрты выпадак, калі галадоўка пратэсту дала плён. Раней посьпеху дабіліся менскія пратэстанты, віцебскія і берасьцейскія прадпрымальнікі. Праўда, у будучыні галадоўнікаў звычайна чакалі новыя нападкі і падкрэсьленая ўвага органаў улады.

Ужо бліжэйшым часам айцец Аляксандар Шэмет зьбіраецца распачаць будаўніцтва храму.

**Зьміцер Панкавец,**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



**Каплічка, у якой зараз моляцца вернікі (зьверху) і праект новага касьцёлу (унізе).**

# Мілінкевіч сусьветным лідэрам: выратуйце Казуліна

Больш, чым Казулін, у сучаснай Беларусі прагаладаў толькі Аўтуховіч.

Экс-кандыдат у прэзыдэнты 48-я суткі трымае галадоўку ў калёніі «Віцьба». Такім чынам ён дамагаецца разгляду пытаньня пра сытуацыю з правамі чалавека ў Беларусі на Радзе Бясьпекі ААН. Патрабаваньне амаль немагчымае, улічваючы практыку дыпляматычных працэдураў у гэтай міжнароднай арганізацыі. Іншым пунктам патрабаваньняў былога кандыдата зьяўляецца, тое, каб Палітычная рада дэмакратычных сілаў зьвярнулася да прэм’ера Сідорскага з прапановай узяць у свае рукі ўладу, бо Лукашэнка, на думку Казуліна, нелегітымны.

У аўторак 5 сьнежня з дазволу дэпартамэнта па выкананьні пакараньняў нечарговую 30-хвілінную сустрэчу з мужам у калёніі мела Ірына Казуліна. Яна пераконвала мужа спыніць галадоўку, але пакуль Казулін не паддаўся на ўгаворы.

Цяпер вага Казуліна складае 65 кілterritory-грамаў, за час знаходжаньня за кратамі ён страціў больш за 40 кг. І.Казуліна кажа, што яе муж пакуль трымаецца бадзёра, захаваў той жа погляд і гаворку, што і раней.

Казулін ня выключыў свайго выхаду з галадоўкі, але ў тым выпадку, калі ягоныя патрабаваньні падтрымае палітычная рада аб’яднаных дэмакратаў і хоць адна эўрапейская краіна выступіць з прапановай унясеньня ў Раду Бясьпекі ААН пытаньня аб правах чалавека ў Беларусі. Пакуль гэтыя патрабаваньні ня будуць выкананыя, Казулін зьбіраецца працягваць галадоўку.

Казуліну была зробленая прапанова


PHOTO.BYMEDIA.NET

аб пераводзе ў Менск, у Рэспубліканскі турэмны шпіталь, але ён адмовіўся.

Разам з Ірынай Казулінай у «Віцьбу» езьдзіў былы дэпутат і палітвязень Сяргей Скрабец. Летась Скрабец 43 дні прагаладаў у Берасьцейскім ізалятары, таму ведае, што адчувае чалавек пасьля сарака дзён галадоўкі. «Нягледзячы на тое што Казулін цяпер бадзёры, усё можа зьмяніцца ў кожную хвіліну», — кажа ён.

У Казуліна панізіліся ціск і тэмпэратура. Скрабец кажа, што такая працяглая галадоўка так ці інакш адаб’ецца на здароўі лідэра сацыял-дэмакратаў. Тым часам Аляксей Кароль заявіў, што Казулін у любым выпадку застанецца лідэрам партыі, незалежна ад таго, колькі часу ён правядзе за кратамі.

У сераду Аляксандр Мілінкевіч зьвярнуўся з адкрытымі лістамі да Ўладзіміра Пуціна, Джорджа Буша, Ангелы Мэркель і Жака Шырака. «Заклікаю вас зрабіць усё магчымае, каб выратаваць жыцьцё Казуліна і вызваліць палітзьняволеных у Беларусі», — піша ён у звароце.

Днём раней, у аўторак, Аляксандар Мілінкевіч ініцыяваў вылучэньне Казуліна на прэстыжную прэмію Марціна Эналса. «Мужнасьць і рашучасьць Аляксандра Казуліна ў барацьбе за свае правы выклікае захапленьне. Яго галадоўка сёньня зьяўляецца сымбалем імкненьня ўсіх беларусаў жыць у свабоднай дэмакратычнай краіне. Пра яе павінен ведаць увесь сьвет. Гэта ўзнагарода перш за ўсё стане магутным міжнародным патрабаваньнем да рэжыму ў Беларусі — пачаць вызваленьне палітзьняволеных», — напісаў Мілінкевіч.

Прэмію Марціна Эналса прысуджае журы, складзенае з прадстаўнікоў найбуйнейшых сусьветных праваабарончых арганізацый «Amnesty International», «Human Rights Watch», «Human Rights First», Міжнароднай фэдэрацыі правоў чалавека, Сусьветнай арганізацыі супраць катаваньняў ды іншых.

У 2006 годзе ляўрэатамі прэміі былі іранскі журналіст Акбар Гянджы і юрыст-радыёкамэнтатар з Зымбабвэ Арнольд Цунга.

**Зьміцер Панкавец, МБ**

# Мілінкевіча затрымалі шосты раз

Аляксандар Мілінкевіч як даверанная асоба дэмакратычных кандыдатаў займаецца цалкам легальнай справай – зьбірае подпісы ў рамках перадвыбарчай кампаніі. Ягоныя паездкі па краіне выклікаюць нэрвовую рэакцыю ўладаў. У Гародні яму забаранілі праводзіць экскурсію ў старым раёне гораду, у Лідзе «невядомыя» размалявалі аўтамабіль палітыка чырвонай і зялёнай фарбамі, нягледзячы на тое, што аўто ўвесь час знаходзілася пад пільнай увагай міліцыі. А ў Белаазёрску 4 сьнежня палітыка западозрылі... у распаўсюдзе наркотыкаў і алькаголю. Разам зь Мілінкевічам былі затрыманыя ягоны памочнік Аляксей Кавалец ды прэс-сакратар Павал Мажэйка. Супрацоўнікі міліцыі правялі асабістыя надгляд затрыманых і склалі пратакол.

Гэта ўжо шостае затрыманьне Мілінкевіча пасьля прэзыдэнцкай кампаніі.

**Сямён Печанко**

# Сьмерць за сьмерць

У справе банды Марозава пастаўлена кропка. За 16 забойстваў ды іншыя цяжкія злачынствы верхаводы групоўкі адкажуць уласнымі жыцьцямі, астатнія атрымаюць вялікія тэрміны зьняволеньня.

Ліквідацыя гомельскай арганізаванай злачыннай групоўкі, кіраванай Сяргеем Марозавым, — найбольш гучная крымінальная справа апошняга часу. На лаву падсудных трапілі паўсотні чалавек. Ім закідалі забойствы, выкраданьні людзей, гандаль зброяй, рэкет. Крымінальная групоўка, якая тэрарызавала Гомель больш за 10 год, мела надзейныя сувязі ў структурах улады. Былы кіраўнік Упраўленьня па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю і карупцыяй УУС Гомельскага аблвыканкаму па выніках суду атрымаў 18 гадоў зьняволеньня. У зьвязку са справай Марозава працягваецца сьледзтва ў дачыненьні да двух былых намесьнікаў начальніка УУС вобласьці.

Аднак нашумелая справа пакідае шмат пытаньняў. Працэс праходзіў у закрытым рэжыме на тэрыторыі СІЗА Менску. Афіцыйна гэтая акалічнасьць была патлумачаная адсутнасьцю адпаведнага колькасьці падсудных памяшканьня і пытаньнямі бясьпекі. Пры гэтым дзяржаўны тэлеканал АНТ шчыра канстатаваў: пра шматгадовыя зьверствы «марозаўцаў» ведалі ўсе. Цяпер і сапраўды ўсе ведаюць пра падрабязнасьці стварэньня і разьвіцьця гомельскай групоўкі: пра татальны рэкет бізнэсоўцаў, забойствы канкурэнтаў і выпадковых асобаў, спробы легалізацыі «бізнэсу» і зрошчваньне з прадстаўнікамі мясцовай і рэспубліканскай улады. Пра зьвярыны нораў кіраўніка банды Сяргея Марозава, урэшце.

Незалежныя журналісты маюць свае меркаваньні наконт прычынаў закрытасьці працэсу.

Гомельская журналістка Марыя Шыманоўская лічыць, што такі працэс мусіў адбыцца толькі ў Гомелі. Каб месьцічы адчулі нарэшце сябе абароненымі, бо гэтыя жудасныя злачынствы адбываліся менавіта ў «ціхім» горадзе над Сажом. На думку М.Шыманоўскай, справа замоўчваецца праз замяшанасьць у ёй міліцэйскіх чыноў.

Спэцыяліст у журналісцкіх расьсьледаваньнях Сяргей Сацук мяркуе, што «марозаўская» справа разбурае міт пра стабільнасьць беларускага грамадзтва. Прэзыдэнт гучна заявіў пра канчатковую перамогу дзяржавы над арганізаваным крыміналітэтам. І тут робіцца немагчымым далей хаваць дзікую злачыннасьць у Гомелі, удзельнікам групоўкі закідаюць стварэньне альбо ўдзел у злачыннай арганізацыі (арт.285 КК РБ). Як такое магло здарыцца ў пару росквіту беларускай стабільнасьці? Калі ўсім усё было вядома, то чаму шэраг гомельскіх чыноўнікаў, чыя кар’ера імкліва расла ў часы сталеньня банды Марозава, апынуўся ў выніку павышэньня ў сталіцы? І чаму гэтыя чыноўнікі маўчаць — павінны ж быць у курсе справы паводле службовых абавязкаў? Напрыклад, Леанід Глухоўскі, які доўгі час быў паўнамоцным прадстаўніком прэзыдэнта ў Гомельскай вобласьці і займаў высокія пасады ў структурах МУС Гомельшчыны, а пасьля і Беларусі. Як і Анатоль Куляшоў ды Аляксандар Рак, якія пэўны час займалі высокія міліцэйскія пасады ў гомельскім аблвыканкаме, а потым апынуліся ў Менску.

Спадар Сацук канстатуе, што перамога над «марозаўцамі» не палепшыла сытуацыі ў Гомелі. Па яго сьведчаньнях, там адбываецца імклівы перадзел вызваленай тэрыторыі ды аднаўляюцца найгоршыя крымінальныя традыцыі — разборкі, рэкет і г.д. У наступным годзе падобная справа ў дачыненьні да рэчыцкай злачыннай групоўкі, што дзейнічала блізу 12 год, будзе разглядацца ў гомельскім абласным судзе.

Прысуд кіраўнікам марозаўскай групоўкі агаліў яшчэ адзін аспэкт – Беларусь па-ранейшаму застаецца адзінай эўрапейскай краінай, дзе выконваюцца сьмяротныя пакараньні. Практыка непразрыстых працэсаў, калі на падсудных могуць павесіць што заўгодна, палітычныя забойствы, напрыклад, выклікае неспакой у праваабаронцаў. Гары Паганяйла не выключае такога варыянту, бо гэта дае зручную магчымасьць канчаткова пахаваць нязручную палітычную справу.

**Сямён Печанко**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Банда Марозава сапсавала кар’еру Леаніду Глухоўскаму.**



«КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА» В БЕЛАРУСИ

АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Сьвятары: сьмяротная кара мае права на існаваньне

**Праваабаронца Міхаіл Пастухоў:** «З аднаго боку, гэтая банда за свае жудасныя злачынствы заслугоўвае адпаведнага пакараньня. Тым ня менш, лічу неабходным кіравацца эўрапейскай традыцыяй, якая забараняе сьмерць у якасьці пакараньня. Прынцып — не дзяржава дае чалавеку жыцьцё, не яна ім і распараджаецца».

Праваабаронца бачыць альтэрнатывай сьмяротнаму пакараньню пажыцьцёвае зьняволеньне, што было б абгрунтавана і гуманістычна, і юрыдычна. Галоўнай жа нагодай для адмены сьмяротнага пакараньня ў Беларусі сп.Пастухоў лічыць патэнцыйную небясьпеку г.зв. ідэальных забойстваў, якія, магчыма, ужо практыкуюцца ў дачыненьні да палітычных апанэнтаў. Таму, на яго думку, адмены сьмяротнага пакараньня трэба дамагацца як найхутчэй.

**Пробашч грэка-каталіцкае (уніяцкае) парафіі Сьв. Язэпа а.Андрэй Абламейка** (Менск) кажа, што касьцёл не выступае наўпрост супраць сьмяротнага пакараньня. «Кожная асоба, як тварэньне Божае, мае права на абарону ад гвалту, як і грамадзтва — супольнасьць людзкая — таксама мае права на абарону ад злачынцаў, якія могуць быць ізаляваныя ў турме і нават пакараныя сьмерцю. Але гэта такое агульнае тлумачэньне», — зазначае а. Абламейка. Кожны канкрэтны выпадак патрабуе індывідуальнага падыходу, мяркуе сьвятар.

**Сьвятар праваслаўнай Сьвята-Ўладзімерскай царквы а.Аляксандар Велісейчык** (Горадня) лічыць сьмяртнае пакараньне дылемаю, што стаіць перад грамадзтвам ад часоў князя Ўладзімера. Кіруючыся запаведзьдзю «Не забі», далучаны царквою да ліку сьвятых князь паўстаў перад выбарам: караць ці не караць сьмерцю рабаўнікоў, што тэрарызавалі кіеўскія шляхі. Пэўны час ён не забіваў ліхадзеяў, аж пакуль іх ня стала непамысна шмат і пакуль не абурыліся япіскапы. Яны зьвярнуліся да Ўладзімера са словамі апостала Паўла, сэнс якіх у наступным: начальнік — гэта божы слуга, які недарэмна носіць меч у пакараньне тым, хто робіць злое. З таго часу сьвяты Ўладзімер ізноў пачаў караць сьмерцю ліхадзеяў, але рабіў гэта як начальнік над людзьмі, грамадзянская асоба. На думку а.Аляксандра, пытаньне сьмяротнага пакараньня належыць вырашаць грамадзтву.

# Беларуская атамная станцыя паўстане ў Чавусах да 2013 году

1 сьнежня адбылася нарада ў Адміністрацыі прэзыдэнта па пытаньні пабудовы ў нашай краіне атамнай электрастанцыі. Навукоўцы-тэхнары з Нацыянальнай акадэміі навук выказаліся за пабудову ў Беларусі такой станцыі аднагалосна. Быў ухвалены дакумэнт, які прадугледжвае пачатак падрыхтоўкі да будаўніцтва ўжо з канца гэтага году, — тэмпы проста ўражваюць.

На нарадзе прысутнічаў кіраўнік дзяржавы Аляксандар Лукашэнка, які чарговы раз заявіў, што пабудова АЭС — гэта ледзьве не адзіны шлях, які дазволіць захаваць у краіне энэргетычную бясьпеку. «Цэны на энэргарэсурсы, якія ўвесь час растуць, настойліва прымушаюць нас шукаць новыя аптымальныя варыянты разьвіцьця беларускай энэргетыкі», — сказаў А.Лукашэнка.

Летась Беларусь была вымушаная заплаціць за замежныя энэргарэсурсы больш за 5 мільярдаў даляраў ЗША. Гэта складае амаль пятую частку ВУП краіны. Налета, з ростам цэнаў на расейскі газ, сытуацыя ўскладніцца. Доля імпартаваных энэргарэсурсаў складае 85%. Пабудова ўласнай АЭС магутнасьцю 2 млн кВт дазволіць Беларусь штогод эканоміць каля 4,5 млрд кубамэтраў газу.

А.Лукашэнка сказаў, што першыя энэргаблёкі атамнай станцыі мусяць быць узьведзеныя яшчэ ў 2013 годзе, хаця раней гаворка вялася пра 2015 год. Месцам для пабудовы беларускай АЭС абраная Краснапалянская пляцоўка ў Чавускім раёне, што на Магілёўшчыне. Аднак канчатковае рашэньне пра разьмяшчэньне будзе прынятае па выніках дадатковых геалягічных і экалягічных дасьледаваньняў, аналізу сэйсьмічных і тэктанічных паказьнікаў.

«Гэта аргумэнтаваная і ўзгодненая пазыцыя. Навукоўцы зыходзілі ня толькі з нашых унутраных патрэбаў у энэргіі, але скарысталі ўвесь сусьветны досьвед, які сьведчыць, што ў будучыні ядзерная энэргетыка стане асноўным сродкам пераадоленьня глябальнага энэргетычнага крызісу», – падае словы А.Лукашэнкі агенцтва БелТА.

А.Лукашэнка ўпэўнены, што пры належным інфармаваньні па пытаньні энэргабясьпекі і атамнай энэргетыкі беларускі народ адкіне ўбок усе свае фобіі, што датычаць АЭС, і згодзіцца на яе пабудову. Раней Лукашэнка казаў, што рашэньне аб пабудове атамнай ЭС будзе прынятае толькі са згоды насельніцтва, праз рэфэрэндум, аднак цяпер выглядае, што ніякага рэфэрэндуму ня будзе.

Супрацоўніца Міністэрства эканомікі Беларусі Ніна Тагановіч кажа, што пабудову ў Беларусі АЭС варта разглядаць з двух бакоў — station станоўчага і адмоўнага.

Да станоўчага, на думку Н.Тагановіч, адносяцца выцясненьне арганічнага паліва ў балянсе энэргарэсурсаў і дывэрсыфікацыя імпарту энэргарэсурсаў за кошт закупкі ядзернага паліва ў другіх краінах, а не ў Расеі. Да адмоўнага ж — высокая капіталаёмістасьць аб'екту, тэндэнцыя росту цэнаў на ядзернае паліва, зьяўленьне

# Меркаваньні дзеляцца папалам

Што думае пра пэрспэктыву пабудовы АЭС у Беларусі беларуская інтэлігенцыя, якія аргумэнты «за» і «супраць» выстаўляе яна?

**Вячаслаў Хадасоўскі, рэдактар газэты «Белорусы и рынок»:** «Насамрэч гэта непазьбежнасьць. Альтэрнатывы пабудовы атамнай станцыі ў Беларусі цяпер няма. Самае важнае цяпер — захаваць галоснасьць і адкрытасьць пры будаўніцтве. Трэба, каб беларусы маглі ведаць усе праекты, варыянты, партнэраў, месцазнаходжаньне, пакуль жа гэта ня надта ўжо агучваецца нашымі чыноўнікамі. На апошняй нарадзе не прагучала ніводнай лічбы, таму я мяркую, што ва ўраду няма ніякіх прыкідак наконт будаўніцтва АЭС».

**Уладзімер Дзюба, рэдактар часопісу «Абажур»:** «Што б мы ні казалі, але ў нашай сытуацыі мы мусім шукаць выйсьце, каб узмацніць энэргетычную бясьпеку краіны, і такое выйсьце бачыцца праз атамную станцыю. Канечне, лепш было б, каб Беларусь пачала выпрацоўваць альтэрнатыўныя сродкі паліва, як робяць у Заходняй Эўропе, але на гэта няма ні грошай, ні часу. Атамная станцыя, канечне, патрэбна, каб пасьля не шукаць літасьці ва ўсходняга суседа».

**Віктар Івашкевіч, намесьнік старшыні Партыі БНФ:** «Асабіста я стаўлюся катэгарычна адмоўна, бо атамныя станцыі лічу мінулым энэргетыкі. Пабудова беларускай АЭС будзе зьяўляцца не інтэнсіўным, а экстэнсіўным шляхам разьвіцьця беларускай энэргетыкі. Трэба працаваць з альтэрнатыўнымі сродкамі, якія цяпер пашыраюцца ў сьвеце, яны не прынясуць нам выгады зараз, але ў такім разе мы выйграем у пэрспэктыве».

**Мілана Міхалевіч, выкладчыца:** «У мяне язык не паварочваецца пасьля Чарнобыльскай трагедыі назваць атамную энэргетыку бясьпечнай, таму я гатова плаціць болей грошай за больш дарагую энэргетыку, чым увесь час пачувацца ў небясьпецы. Таму я выступаю супраць пабудовы АЭС».

**Васіль Несьцярэнка, дырэктар Інстытуту радыяцыйнай бясьпекі «БЕЛРАД»:** «Катэгарычна адмоўна. У Беларусі няма патрэбных кадраў, інжынэрнай інфаструктуры. АЭС у эканамічным пляне нам абыдзецца нам даражэй, чым паліва, якое мы маем цяпер, бо ў любым выпадку мы пабяжым да Расеі, няма розьніцы — ці па газ, ці па ўран. Будаўніцтва АЭС — тэхнічна складаная справа; як на мой погляд, то нам найперш трэба разабрацца з наступствамі

ў краіне аб’екту з павышанай патэнцыйнай небясьпекай для навакольнага асяродзьдзя.

«Пры выбары краіны, якая будзе гэту станцыю будаваць, мы павінны паставіць у гэтым пляне самую жорсткую ўмову», — падкрэсьліў А.Лукашэнка. Найбольш імаверным выглядае, што пабудовай АЭС зоймецца расейскі, францускі ці нямецкі бок, раней таксама разглядаўся іранскі варыянт, але ад яго пакуль вырашана было адмовіцца. Расейскі варыянт таньнейшы, але менш надзейны.

Каштаваць пабудова станцыі для Беларусі будзе ў межах 2,5—5 млрд даляраў, канчатковы кошт яшчэ не падлічаны. Забясьпечваць энэргіяй АЭС зможа 25% тэрыторыі Беларусі.

Варта адзначыць, што беларускае грамадзтва да сёньня неадназначна ўспрымае ідэю пабудовы ў нашай краіне АЭС, бо яшчэ ня сьцерліся ўспаміны ад страшнай катастрофы, што адбылася на Чарнобыльскай станцыі ў 1986 годзе. Беларусь тады стала эпіцэнтрам трагедыі. Радыяцыяй былі заражаны дзясяткі беларускіх раёнаў.

Супраць будаўніцтва атамнай станцыі ў Беларусі катэгарычна выказваецца трохразовы алімпійскі чэмпіён у веславаньні, былы дэпутат палаты прадстаўнікоў Уладзімер Парфяновіч. «Я ўвогуле супраць атамнай энэргетыкі, а ў беларускіх умовах яна небясьпечная ўдвая, — кажа У.Парфяновіч. — Беларусь ужо перажыла Чарнобыль, таму на другую такую рызыку мы ня маем права. Яшчэ адзін пункт: зараз мы будуем атамную станцыю, пасьля захочам займець атамную бомбу».

Рэфэрэндумы па пытаньні пабудовы АЭС Уладзімер Парфяновіч лічыць бессэнсоўнымі, бо нашы ўлады, на думку экс-чэмпіёна, «напішуць усё адно тыя лічбы, якія захочуць».

Атамныя станцыі маюць таксама сумежныя зь Беларусьсю краіны — Расея, Украіна, прынята рашэньне пра пабудову АЭС у Польшчы, а прыбалтыйскія краіны вырашылі распачаць будаўніцтва адной АЭС на тры краіны на базе былой Ігналінскай у Літве.

У сьвеце тэндэнцыя да будаўніцтва АЭС у цэлым не зьніжаецца. Праграмы атамнага будаўніцтва разгортваюць Кітай і Францыя. Лічыцца, што сумарная шкода ад выкідаў цеплавых электрастанцый большая, чым ад атамных.

У мэтах энэргетычнай бясьпекі АЭС для Беларусі сапраўды патрэбна. Ніякіх альтэрнатыўных крыніцаў энэргіі ў краіне не праглядаецца.

**Зьміцер Панкавец**

чарнобыльскай трагедыі, а ўжо потым думаць пра ўласную станцыю».

**Віталь Васількоў, грамадзкі лідэр з Магілёва:** «Я працаўнік будаўніцтва АЭС, асабліва на Магілёўшчыне, якая ў свой час значна пацярпела ад Чарнобылю».

**Уладзімер Някляеў, паэт:** «Калі адкінуць убок усе эмоцыі, зьвязаныя з чарнобыльскай трагедыяй, і зірнуць у вочы факту, што Беларусі рэальна можа не хапаць энэргетыкі, то будаваць такую станцыю, безумоўна, трэба. Бо альтэрнатыўныя крыніцы яшчэ не даюць энэргіі ў прамысловых колькасьцях. З чыста прагматычнага пункту гледжаньня я выказваюся за».

**Апытваў ЗП**

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

### Абвешчана, што Беларуская АЭС будзе збудаваная пад Чавусамі. Вы падтрымліваеце ідэю пабудовы АЭС?

| | |
|---|---|
| Падтрымліваю | 28 (14.1%) |
| Толькі калі паводле францускай тэхналёгіі | 55 (27.8%) |
| Толькі калі яе збудуюць у Драздах | 48 (24.2%) |
| Я супраць | 67 (33.8%) |

Усяго прагаласавала 21.30 6 сьнежня: 198

**З гісторыі атамных станцый у Беларусі**

У 1983 у Беларусі пачалі будаўніцтва электрастанцыі на ядзерным паліве – Менскай АЦЭЦ. Адначасова вялася гаворка пра пабудову асобнай атамнай станцыі магутнасьцю 6 млн кВт, аднак пасьля Чарнобылю гэтыя працэсы замарозілі. У 2001 урад Навіцкага меркаваў укласьці грошы ў дабудову Смаленскай АЭС, якая магла б пастаўляць энэргію ў Беларусь. Тым самым меліся забіць двух зайцоў: атрымаць энэргію і ўнікнуць пабудовы станцыі ўнутры краіны.

Эмацыйнае падарожжа ў тыя дні, калі сэйсмографы паэтычных душаў зашкальвала.



# Вершы пра Плошчу

На гэтым тыдні зьявілася кніга «Рэпартаж зь месца падзеяў: вершы й песьні Плошчы». Кніга мае зручны кішэнны фармат і аформлена ў бел-чырвона-белых колерах, у яе ўвайшлі вершы, што былі напісаныя падчас і пасьля сакавіцкіх падзеяў на Плошчы. У прадмове да «Рэпартажу...» пішацца: «Кніжка, якую вы трымаеце ў руках, можа быць эмацыйным падарожжам у тыя дні, калі сэйсмографы паэтычных душаў зашкальвала. Калі ў сэрцы апошняй эўрапейскай дыктатуры проста на сьнезе зьявіліся кветкі свабоды».

Кніга мае тры разьдзелы. У першы ўвайшлі вершы Славаміра Адамовіча, Андрэя Хадановіча, Сяргея Прылуцкага, Цемрыка Велета, Веры Бурлак, Алеся Аркуша.

Андрэй Хадановіч у вершы «Памяці намётаў на пляцы Кастуся Каліноўскага» піша:

«Значыць, будзем стаяць на лёдзе —
падкачаў, падкачаў надыход вясны.
Але свабода ізноў у модзе,
Але свабодзе ня скажаш «годзе!»,
Але свабода яшчэ на свабодзе,
На свабодзе — нашы сны!»

Другую частку склалі вершы Алены з Кастрычніцкай, Дар’і Ліс, Яўгеніі Казловай, Юліі Шадзько, Натальлі Бордак, Стася Пачобута, Зьмітра Сьвірскага, Дзьмітрыя Калейчыка, Тацяны Лугаўскай, Надзеі Дзедавай.

Большасьць твораў першых двух разьдзелаў у свой час былі надрукаваныя на старонках «Нашай Нівы».

Ну і, нарэшце, ў апошні разьдзел увайшлі вершы аўтараў, якія зьмяшчалі свае творы ў Інтэрнэце. Гэта жж-карыстальнікі shuver, hondurazian, rady-de, ulyana-lenina, а таксама творцы, што падпісваліся пад нікамі by anysyst, by Bullochka, by tvorchaje_dziva і by miafk.

Шукайце «Рэпартаж з Плошчы» ў незалежных распаўсюднікаў.

**ЗП**

# Квасьнеўскі: Спыніць ізаляцыю Беларусі

Аляксандар Квасьнеўскі у панядзелак у Варшаве заклікаў Эўрасаюз пачаць перамовы зь Менскам.

«Ранейшая палітыка ЭС у дачыненьні да Беларусі не дае ніякага толку. Правы чалавека як парушаліся, так і парушаюцца, і няма шанцаў на хуткую дэмакратызацыю, — сказаў былы прэзыдэнт Польшчы. — Беларускі рэжым рэпрэсіўны, але не крывавы і не злачынны. Калі ўжо мы вядзём перамовы з Іранам, Паўночнай Карэяй ці Кубай, тады чаму не гаварыць зь Беларусьсю?»

Гэтыя словы Квасьнеўскі прамовіў у часе першай імпрэзы свайго фонду «Amicus Europae», створанага для прапаганды эўраінтэграцыі. Квасьнеўскі — першы буйны эўрапейскі палітык, які сказаў наўпрост, што трэба сесьці за стол перамоваў зь беларускім урадам.

Паводле слоў Квасьнеўскага, наступныя месяцы будуць ключавымі для будучыні стасункаў Эўразьвязу зь Беларусьсю, беручы пад увагу сёньняшнюю палітыку Расеі ў дачыненьні да Лукашэнкі.

Што варта зрабіць? Паводле Аляксандра Квасьнеўскага, асаблівая роля належыць краінам, якія зацікаўленыя ў разьвіцьці ўсходняга вэктару эўрапейскай палітыкі, а менавіта Нямеччыне, Польшчы, Літве і Ўкраіне. Яны павінны выступіць з сумеснай ініцыятывай, тым больш што ад студзеня 2007 году Нямеччына на паўгоду стане на чале Эўразьвязу.

Брусэль апошнім часам зьмяняе курс у дачыненьні да Менску. Нейкі час таму Эўрапейская камісія паабяцала Беларусі дапамогу ўзамен за адмову ад варожасьці і дэмакратызацыю. Сярод прапановаў Эўразьвязу Беларусі — адкрыцьцё эўрапейскага рынку для беларускага тэкстылю і іншых тавараў, фінансавая дапамога прадпрыемствам, разьвіцьцё транспартнай інфраструктуры, ліквідацыя гандлёвых бар'ераў, інтэграцыя беларускай энэргасыстэмы ў эўрапейскую (праз Польшчу ці Літву), праграма стыпэндый для студэнтаў, спрашчэньне візавых працэдураў.

Нагадаем, што Квасьнеўскі разам з Бразаўскасам быў названы ў ліку магчымых пасярэднікаў на перамовах між Эўропай і Беларусьсю лідэрам сацыял-дэмакратаў Уладзімерам Нісьцюком у яго т.зв. «віленскіх прапановах».

**Вольга Данішэвіч; МБ**

# Усё гэты Сідорскі...

Януковіч размаўляў зь Сяргеем Сідорскім пра неабходнасьць дэмакратычных зьменаў.

Падчас візыту ў Вашынгтон украінскі прэм'ер выказаў заклапочанасьць станам дэмакратыі ў Беларусі.

Адказваючы на пытаньні пасьля выступу ў Цэнтры стратэгічных і міжнародных дасьледаваньняў, ён адзначыў, што гутарыў пра гэта з прэм'ерміністрам Беларусі Сяргеем Сідорскім на паседжаньні прэм'ераў краін СНД у Менску.

«Беларусы самі адчуваюць неабходнасьць дэмакратычных зьменаў, і, думаю, яны будуць праходзіць эвалюцыйна», — сказаў Януковіч.

Таксама ён адзначыў, што адносіны зь Беларусьсю будуюцца на прынцыпе ўзаемавыгады, а палітыка Беларусі што да Ўкраіны — сяброўская, стабільная і добрасуседзкая.

**«Украінская праўда»**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сяргей Калякін.**

# Няма сэнсу

Камуністы і грамадоўцы будуць байкатаваць мясцовыя выбары.

Зьезд Партыі камуністаў Беларускай рэкамэндаваў усім прэтэндэнтам ПКБ у дэпутаты зьняць кандыдатуры. Рэдактар газэты «Товарищ» Сяргей Вазьняк патлумачыў гэта прызнаньнем А.Лукашэнкі, што прэзыдэнцкія выбары былі сфальсыфікаваныя, і тым, што ніводзін вылучэнец ад ПКБ ня быў уключаны ў выбарчыя камісіі.

Рашэньне камуністаў падтрымаюць таксама сацыял-дэмакраты з БСДП («Грамада»). Аб падтрымцы такога рашэньня заявілі ўжо некаторыя абласныя арганізацыі партыі. Лідэры Партыі БНФ і АГП пакуль не прынялі рашэньня адносна ўдзелу іхных кандыдатаў.

**Мікола Бугай**

# Дык ці адраджаюцца пэрсанальныя пэнсіі?

Прэс-сакратар Лукашэнкі абверг інфармацыю пра штомесячнае грашовае забесьпячэньне чыноўнікам.

На сайце «Беларускі партызан» зьявілася інфармацыя, што А.Лукашэнка прызначыў высокім дзяржаўным чыноўнікам, якія дасягнулі пэнсійнага веку, адмысловае штомесячнае грашовае забесьпячэньне. Атрымліваць яго змогуць тыя, хто ня менш за пяць гадоў адпрацаваў на высокіх дзяржаўных пасадах. Яны штомесяц будуць атрымліваць датацыі ў памеры 75% ад заробку. Намесьнікам першых асобаў дзяржавы, старшыням аблвыканкамаў — 70% зарплаты. Членам ураду й дэпутатам — 65% зарплаты. Прычым гаворка, піша «Партызан», не пра аклад, а якраз пра зарплату — г.зн. з улікам сумы з надбаўкамі за званьне, асаблівыя ўмовы службы, выслугу гадоў. Не дадуць пэнсіяў толькі тым, хто быў звольнены за грубыя парушэньні.

Гэта быў бы фактычна аналяг савецкіх пэрсанальных пэнсіяў, толькі нашмат большы ў параўнаньні зь сярэдняй пэнсіяй па краіне. Дэпутат атрымліваў бы на сёньня мільёна паўтара ў кішэню штомесяц. «Партызан» цьвердзіць, што рашэньне было ўжо негалосна прынятае.

Прэс-сакратар кіраўніка дзяржавы Павал Лёгкі ў гутарцы з карэспандэнтам «Нашай Нівы» сказаў, што ня мае такіх зьвестак.

**Зьміцер Панкавец**

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ



**Будуць пэнсіі ці не? Анатоль Малафееў і Сяргей Касьцян у палаце прадстаўнікоў.**

# Наступнікам Пуціна будзе праваслаўны кагэбіст

Да сьпісу магчымых пераемнікаў Пуціна ўсё часьцей далучаюць імя кіраўнік Расейскай чыгункі.

58-гадовы Ўладзімер Якунін кіруе «Российскими железными дорогами», у распараджэньні якіх 86 тыс. км расейскіх шляхоў. Таму яго часта называюць «жалезным Уладзімерам».

У маладосьці ён рабіў кар'еру ў гандлёвых прадстаўніцтвах СССР на Захадзе, што зьяўляліся шырмай для замежнай дзейнасьці КГБ. Газэта «Русская мысль» называе яго, як і Пуціна, «кадравым афіцэрам разьведкі».

Былы агент КГБ вылучаецца сваёй падкрэсьленай праваслаўнасьцю. Ягоны фонд сьв.Андрэя Апостала, што дзейнічае за грошы чыгуначнай імпэрыі, сьцягвае ў Расею рэліквіі праваслаўных сьвятых. На кожныя Каляды ён прывозіць у Маскву жыватворны агонь з Храму Божага Нараджэньня ў Ерусаліме.

Якунін кіруе таксама Цэнтрам нацыянальнай славы Расеі, які арганізуе за чыгуначныя грошы канфэрэнцыі «Дыялёг цывілізацыяў», дзе даводзіцца перавага праваслаўнай цывілізацыі над заходняй.

Аднак найважнейшым аргумэнтам на карысьць «праваслаўнага чыгуначніка» ёсьць тое, што ён быў суседам Пуціна па лецішчы пад Пецярбургам. З таго часу прэзыдэнт, мяняючы працу, усюды бярэ яго з сабою.

Чыгунка, разам з газаправодамі, арміяй, пракуратурай і спэцслужбамі, — адна са структураў, што яднаюць гіганцкую і стракатую Расею. «Газпром» лабіруе ва ўладу кандыдатуру віцэ-прэм'ера Дзьмітрыя Мядзьведзева, сілавікі — іншага «віцэ-», Сяргея Іванова. Аднак Пуцін сапраўды можа паставіць на сярэдняе арыфмэтычнае. Незалежныя кандыдаты ў Расеі шанцаў пакуль ня маюць.

Варта нагадаць, што дарадцам Якуніна працуе былы шэф беларускага КДБ Ерын, адстаўлены ў 2004 годзе.

**Вольга Данішэвіч**

WWW.COMPROMAT.RU



**Другі зьлева — Уладзімер Якунін. Першы справа — Уладзімер Пуцін.**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Інтэрнат

Здалёк сіценскі інтэрнат нагадвае вялікую вясковую хату: доўгі драўляны барак з двума ўваходамі, па дзесяць вокнаў з кожнага боку. Збудаваны ў 1961-м, у год палёту Гагарына й хрушчоўскай грашовай рэформы, сьпярша ён прызначаўся для прыежджых работнікаў леспрамгасу; пазьней, за Машэравым, сюды пачалі засяляць «хімікаў». Першы за 45 гадоў рамонт зрабілі толькі летась — надалі цывільны выгляд некалькім «хімічным» пакоям акурат перад маім прыездам — а начальства з аб'яднаньня, напалоханае чуткамі пра візыт нейкага важнага зэка зь Менску, завезла сюды раскошныя ложкі з уласнай мэблевай фабрыкі.

У нашай частцы інтэрнату чатыры пакоі. У адным жывуць майстрыха з мужам, у іншых двух — «хімікі», і адзін пакой зарэзэрваваны за міліцыянтамі, якія падчас падзеяў у Менску наладжваюць тут «ганаровую варту». Увогуле, міліцыянты — участковы, супрацоўнікі полацкага райаддзелу або ветрынскае спэцкамэндатуры — завітваюць у інтэрнат рэгулярна. Прычынаю таму, апроч менскіх, віцебскіх і замежных гасьцей, — нефармальны статус інтэрнату як тутэйшае «маліны». Вясковыя алькаголікі, беглыя «хімікі» й асобы бяз пэўнага месца жыхарства штовечар цягнуцца сюды, бо тут можна каўтнуць «максімкі» пад блатны шансон, (радзей) закусіць і нават, калі пашэнціць, пераначаваць на адным ложку зь якой-небудзь сіценскай *прынцэсай*.

Паколькі санвузел у інтэрнаце не прадугледжаны, шматлікія «госьці» нападпітку, як іх ні выхоўвай, спраўляюць малую патрэбу проста з ганку або пад вокнамі (добра, што па вялікай хаця б адыходзяць за плот).

Узгадваю інтэрнаты, дзе даводзілася жыць раней. Рабочы ў Барані, пад Воршай, дзе бацькі з траімі дзецьмі туліліся ў адным пакойчыку. «Алімпіядныя» ў Наваполацку й Менску, дзе школьная эліта — выдатнікі! — дапаўшы да волі, жлукціла гарэлку й зацягвала пад гітару мацерныя песенькі. Студэнцкі на праспэкце Машэрава (калі ў ім у 70-х гадох мінулага стагодзьдзя жылі бацькі, гэта была яшчэ Паркавая; цяпер, калі жывуць нашыя наступнікі, — Пераможцаў), дзе «аўганцы» увесь час біліся зь «юрыстамі», а потым прыяжджалі

## ХРОНІКА

**Угодкі Слуцкага збройнага чыну**

3 сьнежня актывісты Партыі БНФ і моладзь БНФ зладзілі прымеркаваную да ўгодкаў Слуцкага паўстаньня вандроўку на Случчыну. У часе паездкі яе ўдзельнікі восем разоў сустракаліся з прадстаўнікамі праваахоўных органаў. Падчас раздачы друкаваных матэрыялаў былі затрыманыя мясцовыя актывісты **Павал Філіпеня** і **Віталь Амяльковіч**, якіх неўзабаве адпусьцілі без складаньня пратаколаў, на менчука **Міколу Якушава** склалі пратакол аб распаўсюдзе незарэгістраванай друкаванай прадукцыі і адпусьцілі. Перад выездам са Слуцку міліцыянты, у прысутнасьці чалавека ў цывільным, запісалі пашпартныя зьвесткі ўдзельнікаў вандроўкі. Цягам дня міліцыя суправаджала аўтобус, «перадаючы» яго з раёну ў раён.

**У Барысаве** моладзевыя актывісты таксама адзначылі гадавіну Слуцкага збройнага чыну. Да крыжа, усталяванага ў памяць ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў, прыйшло некалькі дзясяткаў актывістаў кампаніі «За свабоду». Напярэдадні моладзевыя актывісты распаўсюдзілі ў горадзе тысячы налепак «Джынс – за свабоду!»

**29 лістапада**

Адлічаныя **Аляксандар Страчук** і **Дзяніс Сарокін**, студэнты аграэкалягічнага факультэту Горацкай акадэміі. А.Страчук балятуецца ў Горацкі гарсавет, а Дз.Сарокін — сябра ягонай ініцыятыўнай групы. Адміністрацыя акадэміі не азнаёміла студэнтаў з вымовамі, толькі паінфармавала.

Былы дэпутат палаты прадстаўнікоў **Генадзь Дылеўскі** асуджаны на 5 гадоў турмы за «падбухторваньне да дачы хабару ў памеры 75 тысяч даляраў». Г.Дылеўскі да арышту працаваў дырэктарам «Беларускага марскога параходзтва», а ў палаце прадстаўнікоў быў сябрам дэпутацкай групы «Рэспубліка», як і Сяргей Скрабец, што толькі нядаўна выйшаў з турмы.

**130 працаўнікоў** АТ «Добруская папяровая фабрыка «Герой працы» напісалі заявы аб выхадзе з афіцыйнага прафсаюзу. Прычына — незадаволенасьць нізкімі заробкамі і цяжкімі ўмовамі працы. Працаўнікі кажуць, што прафсаюз нічога ня робіць дзеля паляпшэньня сытуацыі.

Раніцай 29 лістапада на гомельскім заводзе пускавых рухавікоў участковым быў складзены пратакол на грамадзкага актывіста і праваабаронцу **Анатоля Паплаўнога** за парушэньне арт.172 КаАП (распаўсюд друкаваных выданьняў, зьмест якіх скіраваны на нанясеньне шкоды дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку). Артыкул прадугледжвае штраф да 5 мін. заробкаў і канфіскацыю друкаваных матэрыялаў.

**30 лістапада**

Пастара царквы «Ласка Ісусава» з Крупак **Мікалая Барычэўскага** трэці раз на працягу году наведалі прадстаўнікі ўлады. Сп.Барычэўскага забралі з дому і адвезьлі яго ў РУУС, дзе склалі пратакол за пражываньне ў Крупках без прапіскі. Па словах пастара, яму пагражалі ліквідацыяй суполкі, калі ён ня спыніць крытычных выказваньняў на адрас дзеючай улады.

Увечары на аўтавакзале ў Магілёве была затрыманая актывістка АГП **Крысціна Шацікава**. Яе пратрымалі ў міліцыі каля дзьвюх гадзін, і склалі пратакол аб канфіскацыі друкаванай прадукцыі і ўручылі пазоў зьвіцца ў Ленінскае РУУС Магілёва для дачы паказаньняў.

У Менску затрыманы моладзевы актывіст **Сяржук Гумінскі**. Увагу міліцыянтаў прыцягнуў значак «Пагоня» на вопратцы актывіста. Супрацоўнікі міліцыі адвезьлі моладзевага актывіста ў Ленінскае РУУС сталіцы, дзе на яго былі складзеныя пратаколы за «дробнае хуліганства» і «распаўсюд друкаваных матэрыялаў без выходных дадзеных».

**1 сьнежня**

Ва ўрочышчы Курапаты ў чарговы раз апаганеная **лава Клінтана** – мэмарыяльны знак, падораны прэзыдэнтам ЗША «ад народу Злучаных Штатаў Амэрыкі народу Беларусі ў імя памяці». Вандалы скінулі лаўку на зямлю,раскідалі кветкі і сьвечкі.

Гарадзенская міліцыя папярэдзіла **А.Мілінкевіча** аб тым, што ён ня мае права ладзіць экскурсіі па горадзе для вялікіх групаў людзей. Лідэр апазыцыі прыехаў у Горадню сустрэцца з выбаршчыкамі і сабраць подпісы ў падтрымку дэмакратычных кандыдатаў. Адначасова ён зьбіраўся правесьці экскурсію, каб прыцягнуць увагу да таго, як адбываецца рэканструкцыя гістарычнай часткі Горадні.

**2 сьнежня**

Падчас правядзеньня ў Лідзе палітычнай кампаніі «мясцовыя выбары» невядомыя размалявалі **аўтамабіль А.Мілінкевіча** ў чырвоназялёныя колеры. Увесь час знаходжаньня Мілінкевіча ў Лідзе за ім сачыла міліцыя, людзі ў цывільным, зь якімі таксама працавала камэра і журналісты лідзкага ТБ.

**3 сьнежня**

Кіраўнічка непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў **Анжаліка Борыс** і яе кіроўца **Анджэй**

«географы» й укладвалі на падлогу ўсіх без разбору, улучна з камэндантам; дзе курсанты Акадэміі міліцыі ўначы трэніраваліся выносіць дзьверы і, калі ў пакоі аказваліся хлопцы, яны мусілі за свае грошы бегчы па гарэлку ў бліжэйшы «начнік», а калі дзяўчаты — піць ды гуляць да раніцы з будучымі ахоўнікамі правапарадку.

Узгадваю і думаю, што па-іншаму, пэўна, у інтэрнаце і не бывае. Не свая ж хата, у рэшце рэшт.

Каля паўмільёна насельнікаў Беларусі дагэтуль жыве ў інтэрнатах. А калі дадаць яшчэ й тых, хто здымае пакоі або кватэры... Тых, хто займае дзяржаўныя «квадратныя мэтры»... Дзясяткі тысячаў беларусаў усё сваё жыцьцё ад народзінаў да сьмерці пражываюць вось так, паміж агульнай кухняй і пропускам на вахце. Адсутнасьць *уласнага дому* — прычына многіх дзівосаў псыхалёгіі. Тыповыя насельнікі інтэрнату і да жыцьця ставяцца як да чарговага жытла, у якім пасьля іх застанецца хіба што пыл за спружынным ложкам ды пара пустых бутэлек.

Дый сама цяперашняя Беларусь пасярод Эўропы штогод усё больш нагадвае сіценскі інтэрнат: вакол свойскія хаты, сады ды гароды, а тут — камуналка, камэндант замест гаспадара, праблемы, скандалы, міліцыя і наведнікі — то які-небудзь мясцовы Іран, то тутэйшая Вэнэсуэла.

Апошні барак сацлягеру, кажучы моваю застою.

Ва ўсёй Эўропе ўласны дом — прадмет асаблівага гонару; у сучаснай жа Беларусі — найперш прадмет падазрэньняў (пачынаючы ад катэджаў за акружной дарогай і да Домашавага дому). «Жыльёвае пытаньне» ў нас працягвае па-савецку разбураць, а не *будаваць* людзей.

Вось жыхарам беларускага інтэрнату Брусэль прапануе эўрарамонт. Гатовы зрабіць з бараку гатэль. Адно некалькі ўмоваў — прыбірацца ў хаце, не буяніць, перастаць хадзіць па патрэбе пад вокны — словам, паводзіць сябе, у эўрапейскім разуменьні, *як дома*. Ды для завадатараў сіценскага інтэрнацкага «парадку» і для цяперашняга рэжыму значна цікавейшае пытаньне — а ці будзе ў гэты гатэль, так сказаць, у належных аб'ёмах дастаўляцца з Расеі *гаручае*?..

І ўсё ж беларусы, якія ўжо даўно абжылі інтэрнат, ня хочуць заставацца жыць у інтэрнаце.

Беларусі патрэбен Дом.

А падмурак для ўтульнага Дому на дзесяць мільёнаў чалавек у цэнтры Эўропы — гэта нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

Дзясяткі тысячаў беларусаў усё сваё жыцьцё ад народзінаў да сьмерці пражываюць паміж агульнай кухняй і пропускам на вахце.

## ХРОНІКА

**Лісоўскі** атрымалі пазовы на 6 сьнежня. Яны мусяць зьявіцца на допыт у КДБ да сьледчага, які займаецца крымінальнай справай аб кантрабандзе наркотыкаў.

6 сьнежня быў выкліканы ў міліцыю актывіст Саюзу палякаў **Ігар Банцар**. Ён нібыта пагражаў Тадэвушу Кручкоўскаму — аднаму з кіраўнікоў афіцыйнага Саюзу палякаў Беларусі.

**Алеся Ясюк** была затрыманая ў Менску падчас распаўсюджваньня налепак «Джынс – за свабоду!». Жанчыну адвезьлі ў апорны пункт міліцыі Ленінскага РУУС, дзе, паводле яе словаў, яе зьбіў маёр міліцыі Фалей І.В. Судмэдэкспэртыза зафіксавала ў жанчыны пабоі. Яна рыхтуе скаргу на неправамерныя дзеяньні міліцыянта.

### 4 сьнежня

Палітзьняволены **Павал Севярынец** атрымаў трохдзённы адпачынак, з 4 па 6 сьнежня ўключна. Ён мусіў прыехаць у Віцебск яшчэ 29 лістапада. Аднак напярэдадні ў адміністрацыі выпраўленчай установы Паўлу заявілі, што пакідаць спэцкамэндатуру яму забаронена да 10 снежня.

**Віктар Статкевіч**, бацька палітвязьня Мікалая Статкевіча, зьвярнуўся да начальніка Дэпартамэнту выкананьня пакараньняў Коўчура В. з заявай. В.Статкевіч, сярод іншага просіць вярнуць сына ў Баранавічы, бо праз сталы ўзрост і кепскае здароўе мае патрэбу ў доглядзе. М.Статкевіч быў пераведзены з Баранавіч у Блонь Пухавіцкага раёну.

### 5 сьнежня

Старшыня Менгарсуду М.Ардзяка не задаволіў наглядную скаргу па справе экс-кандыдата ў прэзыдэнты А.Казуліна. Казулін і яго абаронцы маюць намер абскардзіць рашэньне ў Вярхоўным судзе.

Адбылося папярэдняе судовае пасяджэньне Гаспадарчага суду Менску па справе аб скасаваньні дамовы арэнды з **МГА «Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына»**. Судзьдзя Мельнікава азнаёмілася з прэтэнзіямі бакоў. Наступнае пасяджэньне будзе 12 сьнежня.

Судовыя выканаўцы канфіскавалі кампутарную тэхніку **РГА «Беларускі Хэльсынскі камітэт»** (БХК). Зроблена гэта было ў выкананьне рашэньня Вышэйшага Гаспадарчага суду па справе аб падаткаабкладаньні сродкаў, якія былі атрыманыя ў рамках праграмы TACIS.

Беларускія ўлады не згадзіліся на падаўжэньне візаў **сямі ксяндзам і пяці сёстрам-законьніцам**, грамадзянам Польшчы, што працавалі ў Гарадзенскай каталіцкай дыяцэзіі. Да канца сьнежня яны павінны пакінуць Беларусь. Улады тлумачаць рашэньне патрэбай уладкаваць на вызваленыя месцы маладых сьвятароў і сёстраў — беларускіх грамадзянаў.

**СП**



KATKA.PHOTOSIGHT.RU



# Дэмарш Мандэльсона

Цяпер і Брусэль даў зразумець: мухі — асобна, катлеты — асобна. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Эўразьвяз усё ж наважыўся адабраць у Беларусі гандлёвыя прэфэрэнцыі. 5 сьнежня ягоныя экспэрты прагаласавалі «за». Да Калядаў рашэньне могуць ухваліць сталыя прадстаўнікі краінаў ЭЗ. Прычым давесьці справу да лягічнага канца іх заклікаў асабіста камісар Эўразьвязу ў пытаньнях гандлю Пітэр Мандэльсон.

Між тым афіцыйны Менск, камэнтуючы 12 пунктаў ЭЗ, і так пасьпеў ужо закінуць Брусэлю двурушніцтва. Маўляў, на вуснах — мёд, а тым часам робіць сінявокай розныя паскудзтвы. Цяпер прапаганда атрымае новы аргумэнт.

Хаця, нагадвае эканаміст Яраслаў Раманчук, мэханізмы выключэньня запушчаныя даўно. Пытаньне аб уціску прафзьвязаў МАП паставіла яшчэ ў 2004 годзе. У беларускіх уладаў было багата часу, каб давесьці прагрэс у гэтым пытаньні. «Аднае вандроўкі спадарыні Пяткевіч у Жэнэву мала, — кажа Раманчук. — Тым болей што адначасна менавіта праз уціск суполкі незалежнага прафзьвязу галадала Алена Захожая на «Белшыне».

«У Эўразьвязу свая лёгіка, свой альгарытм прыманьня рашэньняў, — кажа палітоляг Алесь Лагвінец. — У межах новай стратэгіі падкрэсьлена, што Эўропа чакае пазытыўных крокаў зь беларускага боку. І мяч цяпер на баку афіцыйнага Менску».

Больш таго, на думку Лагвінца, у вачох Брусэлю давер да беларускіх уладаў як да перамоўнікаў невысокі.

І сапраўды, уявеце: вось сёньня, прыкладам, спынілі б заходнікі працэс пазбаўленьня прэфэрэнцыяў — а назаўтра атрымалі б анучай па твары. І пачуваліся б поўнымі дурнямі.

Са свайго боку, аналітык Андрэй Фёдараў зазначае: гэта лягічна, калі палітыка — у дадзеным выпадку палітыка ЭЗ — спалучае пугу і пернік. Калі на тое пайшло, дык Брусэль крытыкавалі менавіта за брак добрай пугі.

Іншая рэч, што скасаваньне прэфэрэнцыяў яшчэ не выглядае фатальна перадвырашаным, дадае Фёдараў.

Сапраўды, Эўразьвяз ужо дэманстраваў нерашучасьць і непасьлядоўнасьць у гэтым (і ня толькі ў гэтым) пытаньні. Дый вылучэньне знакамітых дванаццаці пунктаў шэраг камэнтатараў расцаніў як падгульваньне рэжыму: толькі лепей будзе шантажаваць Маскву!

Ва ўсякім разе, «дэмарш Мандэльсона» — гэта ўжо трохі іншая мэлёдыя.

Брусэль паказвае гатовасьць дзейнічаць паводле выслоўя Пуціна: мухі — асобна, катлеты — асобна.

Небясьпека страты 300 мільёнаў эўра штогод можа падштурхнуць афіцыйны Менск трохі болей уважліва паставіцца да 12 пунктаў Эўразьвязу. Калі не да ўсіх, то хоць да некаторых.

Зрэшты, можа стацца і наадварот. Распачнецца яшчэ болей зацятая прапагандысцкая рыторыка. Непазьбежныя ў любым выпадку эканамічныя цяжкасьці сьпішуць на Мілера з Мандэльсонам ды на Лябедзьку зь Ярашуком. То бок на «Газпром», Брусэль, апазыцыю і незалежныя прафсаюзы. Маўляў, пятая калёна акурат і наклікала санкцыі.

На думку Яраслава Раманчука, паводзіны афіцыйнага Менску пакуль што вызначаюцца нейкай надзеяй на цуд у нафтагазавым пытаньні. А цуду ня будзе. Так што дыялёг з Эўропай патрэбен найперш беларускім уладам.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Дзяржава для народу



Праект удасканаленьня дзяржаўных структураў. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Калі мы гаворым аб неабходнасьці дзяржаўных структураў адпавядаць крытэрам магічнай формулы «Дзяржава для народу», трэба, каб яны былі кампэтэнтнымі. Што значыць быць кампэтэнтным? Гэта значыць адэкватна рэагаваць на зьнешнія выклікі, апэратыўна ствараць у нетрах вэртыкалі аддзелы, камітэты, групы з экспэртаў у сваёй галіне, якія маглі б шукаць эфэктыўны адказ на згаданы выклік.

Мяркую, што ў кантэксьце апошніх падзеяў наступныя органы павінны стварыць наступныя ўнутраведамасныя структуры.

**1. Адміністрацыя прэзыдэнта:**

— экспэртна-рэдакцыйны аддзел, які вызначае, ці не адыходзіць той ці іншы фотамалюнак у прэсе ад кананічнага вобразу прэзыдэнта, і стварае адпаведны індэкс журналістаў, якім забаронены доступ на мерапрыемствы зь яго ўдзелам;

— кіналягічную службу, байцыжывёлы якой змагаюцца са спробамі забароненых журналістаў патрапіць на мерапрыемствы з удзелам найвышэйшай службовай асобы.

**2. МУС:**

— спэцыяльную мэдычную кансультацыю па праверцы супрацоўнікаў на дальтанізм. Ствараецца ў мэтах падвышэньня эфэктыўнасьці выкрыцьця грамадзянаў, якія маюць на адзеньні антыдзяржаўную сымболіку ў выглядзе камбінацыі белага, чырвонага і белага колераў;

— каманду сьведкаў якая б магла апэратыўна выяжджаць па выкліку на месца затрыманьня і кампэтэнтна пераконваць суд у наяўнасьці ў дзеяньнях апазыцыянэраў элемэнтаў дробнага хуліганства і нецэнзурнай лаянкі;

— дарожную службу аўтаінспэктараў, якая б сачыла за маршрутам руху машыны Мілінкевіча і рэгулярна яго штрафавала за няправільную працу шклоачышчальнікаў і несанкцыянаваную перафарбоўку.

**3. КДК:**

— піяр-аддзел, адказны за падтрыманьне ў грамадзтве іміджу Зянона Ломацяя як бязьлітаснага барацьбіта з карупцыяй.

**4. Камітэт па падатках і зборах:**

— падкамітэт барацьбы з кантрафактнай распушчальнай кавай.

**5. БРСМ:**

— дэпартамэнт па прапагандзе сярод актывістаў БРСМ моды на нашэньне сандалетаў і ботаў айчыннай вытворчасьці.

**6. БТ:**

— трупу артыстаў, якія могуць сыграць прадстаўнікоў сэксуальных меншасьцяў падчас рэпартажу з наступнага Кангрэсу дэмакратычных сілаў.

**7. Міністэрству прамысловасьці:**

— канструктарскае бюро па распрацоўцы новага тыпу паперы, зь якой можна было б незаўважна сьціраць напісаную раней інфармацыю. Пазьней Цэнтравыбаркам зможа лёгка выправіць занадта вялікі працэнт падтрымкі дзейнай улады, атрыманы на выбарах, на крыху меншы.

Нарэшце, усім міністэрствам і ведамствам — лятучыя групы прапагандыстаў для чытаньня перад працоўнымі калектывамі лекцыяў аб сутнасьці Грыгарыянскай рэформы календара. Каб зранку 14 студзеня беларускі народ не «адыходзіў» з галаўным болем ад сьвяткаваньня старога Новага году, а быў гатоў выканаць грамадзянскі абавязак на выбарах у мясцовыя Саветы.



## Карнавал у дні посту

**6 сьнежня а 18-й у Палацы мастацтваў пачаўся Калядны міжнародны праект «Карнавал». Гасьцей віталі гусары й індзейцы, дамы ў боа й растафары, Ленін і яшчэ тузін розных пэрсанажаў Да самага Новага году тут будзе дзеяць вялікая выстава жывапісу, графікі й скульптуры сучасных беларускіх і замежных творцаў. Праект мае на мэце збор дабрачынных ахвяраваньняў для дзяцей-сіротаў. Адметна, што сабраныя сродкі будуць пароўну падзеленыя між каталіцкай і праваслаўнай суполкамі Менску. Таму невыпадкова сярод вясёлага тлуму вэрнісажу знайшліся й паважныя постаці хрысьціянскіх сьвятароў, якія выступілі перад публікай з прывітальным словам.**
**Запрашаюцца ўсе ахвочыя да карнавальных гульняў і тыя, хто цікавіцца сёньняшнім мастацтвам. А таксама ахвотныя ахвяраваць сродкі на калядныя падарункі сіротам.**

# Праваслаўная маральнасьць у школах Гарадзеншчыны

У 17 з 28 школаў Навагрsucceeding Навагрaдчыны і амаль паўсюль на Слонімшчыне дзецям прапануюць факультатыў пад назовам «Асновы праваслаўнай маральнасьці». Гэты курс рэкамэндаваны Нацыянальным інстытутам адукацыі.

Папаўненьне ў школьнай праграме адбылося ў рамках ажыцьцяўленьня «Дамовы аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой» у Гарадзенскай вобласьці. Адпаведны дакумэнт быў распрацаваны летась. Яго падпісалі старшыня Гарадзенскага аблвыканкаму Ўладзімер Саўчанка і япіскапы Гарадзенскі і Ваўкавыскі Арцемі і Навагрaдзкі і Лідзкі Гурый. Па нядоўгім часе такі ж факультатыў пачнуць вывучаць у школах Меншчыны. Старшыня Менскага аблвыканкаму падпісаў зь Філарэтам адпаведную дамову аб супрацоўніцтве.

Паводле зьвестак Навагрaдзкага раённага аддзелу адукацыі, акрамя заняткаў, школьнікам прапануюцца экскурсіі ў Тураў, Полацак, Жыровічы ды іншыя беларускія гарады, багатыя праваслаўнай спадчынай. Сам факультатыў абавязковы для наведваньня. Як і прадмет «Вялікая Айчынная вайна». Школьная адміністрацыя вызначае, ці будзе вучыцель выкладаць толькі «ВАВ», ці праваслаўны факультатыў таксама.

Вучыцелька гісторыі касьцяневіцкай школы ў Слонімскім раёне Кацярына Межавец выкладацьме абодва прадметы. «На маіх занятках вучні не сумуюць, бо разам мы разьбіраем вельмі жыцьцёвыя сытуацыі», — кажа Кацярына. Яна перапрацавала атрыманую ў мэтадычным кабінэце праграму, пераклала яе на беларускую мову. «Першапачатковая праграма была распрацаваная ў Жыровічах і больш пасавала да духоўнай сэмінарыі», — тлумачыць вучыцелька. Новы факультатыў чымсьці нагадвае курс «Чалавек і грамадзтва», прысьвечаны маралі. Ён закранае тэмы дачыненьняў чалавека і прыроды, людзей між сабой. Дзецям расказваюць пра жыцьцё як вялікую каштоўнасьць, дар Божы, пра асабістую адказнасьць за яго. «Я тлумачу дзецям небясьпеку шкодных звычак і амаральных паводзінаў», — кажа спн.Межавец. Факультатыў вывучаюць у старэйшых клясах, і такая інфармацыя тут вельмі дарэчы, мяркуе касьцяневіцкая вучыцелька. Яна лічыць таксама, што ў новым прадмеце няма прапаганды праваслаўя, нягледзячы на назву. «Мяркуйце па назвах тэмаў — «Хрысьціянская мараль — аснова чалавечых узаемаадносінаў», «Хрысьціянскае разуменьне сям'і і шлюбу», «Адрозьненьні хрысьціянскіх і паганскіх сьвятаў» і г.д.», — кажа Кацярына. Яна ўпэўненая, што ўсё залежыць ад пазыцыі вучыцеля. Ёй як верніцы гэты прадмет вельмі важны і актуальны. Паводле словаў вучыцелькі, дзеці поўныя забабонаў, нібыта й не XXI стагодзьдзе на двары.

Галоўны рэдактар газэты «Гарадзенскія епархіяльныя навіны» Аляксандар Шурскі распавёў пра пляны Гарадзенскай япархіі. Адмысловая царкоўная камісія мае распрацаваць навучальную праграму для школаў і прапанаваць яе гарадзкому аддзелу адукацыі. «Гарадзенская япархія мусіць улічыць пэўныя складанасьці, што ўзьніклі ў Навагрaдку ды Слоніме з навучальнай праграмай», — кажа А.Шурскі. Ён кажа, што будучая праграма будзе больш дапасаваная да сьвецкай навучальнай установы. І дадае, што ў Гарадзенскай япархіі справа з праваслаўнай адукацыяй у школах знаходзіцца пакуль у стане распрацоўкі. Піянэрства Навагрaдчыны і Слонімшчыны ў гэтай справе ён зьвязвае з актыўнасьцю мясцовага царкоўнага кіраўніцтва. Адказваючы на пытаньне пра мову навучаньня, сп.Шурскі зазначыў, што ўсё будзе залежаць ад пазыцыі ды ініцыятывы тых, хто будзе выкладаць факультатыў дзецям. Царква ж, найхутчэй, распрацуе праграму па-расейску.

**Сямён Печанко**

**Гэты артыкул выклікаў шмат водгукаў на сайце nn.by**

**cmok напісаў(ла) Лістапад 24, 2006 а 19:17**
А чаму б не выкладаць прадмет: асновы будыйскай маральнасьці? Такімі тэмпамі хутка і ў вузах сьвятары пачнуць навязваць свой сьветапогляд.

**Yahor напісаў(ла) Лістапад 24, 2006 а 23:54 2 cmok**
Асновы хрысьціянскай маралі нічога шкоднага нашаму грамадзтву не прапануюць. Экскурсіі па такіх месцах, як Жыровічы, Полацак, узбагацяць кругагляд дзяцей. Адзінае, што шкалярам, якія належаць да іншых канфэсіяў, трэба дазволіць ненаведваньне гэтага курсу.

**morkva напісаў(ла) Лістапад 25, 2006 а 9:16**
Yahor: Асновы хрысьціянскай маралі нічога шкоднага нашаму грамадзтву не прапануюць.
Але прадмет завецца менавіта «Асновы праваслаўнай маралі»... Як доўга яшчэ праваслаўныя ў Беларусі будуць закладнікамі палітычнага надвор'я? Ці дапаможа ўрэшце гэны курс дзецям не адносіць хрысьціянства і праваслаўе да... розных канфэсіяў?

**Kahemaks напісаў(ла) Лістапад 25, 2006 а 11:34**
Ну, і хто тут займаецца празэлітызмам у Гарадзенскай вобласьці?

**маці напісаў(ла) Лістапад 25, 2006 а 19:03**
Немагчыма ўявіць у сьвецкай адукацыйнай установе талерантнай краіны абавязковыя і нават неабавязковыя факультатывы па маралі якой-небудзь канфэсіі. Гэта сярэднявечча. Калі ў краіне ёсьць свабода веравызнаньня, рэлігійную адукацыю дзеці цудоўна могуць атрымаць у нядзельнай школе адпаведнай рэлігійнай установы, куды іх адвядуць бацькі.

**Яўген напісаў(ла) Лістапад 26, 2006 а 7:57**
Як былы настаўнік дакладна магу сказаць — нічога, акрамя нуды і абыякавасьці да праваслаўя, ня выхаваецца. Будзе пазяханьне і фармалізм.

**Mann Kurt напісаў(ла) Лістапад 26, 2006 а 12:57**
Хай пакуль што праваслаўная, рана ці позна гэты прэцэдэнт згуляе і на карысьць іншых канфэсій. А праваслаўныя ў чарговы раз засьведчаць сваю апору на гвалт і няўменьне весьці спрэчку ў рэчышчы эўрапейскай традыцыі. «Той, хто жыве ў нябёсах, пасьмяецца зь іх».

# Менская моладзь растрывожыла слуцкую міліцыю

«Моладзь БНФ» зладзіла вандроўку ў Слуцак. Яна была прымеркаваная да чарговых угодкаў Слуцкага збройнага чыну. Падчас паездкі яе ўдзельнікі восем разоў сустракаліся зь міліцыянтамі.

Такога не маглі прыгадаць нават сталыя ўдзельнікі штогадовых слуцкіх сьвяткаваньняў Дня герояў. Вэтэранка Фронту Ядзьвіга Пятроўская памятае першыя выезды ў Слуцак — з ганаровым міліцэйскім суправаджэньнем, паўнюткімі аўтобусамі гасьцей і кіраўніком дзяржавы на чале. «А каб не давалі зьехаць са Слуцку, то гэта ўпершыню!» — дзівіцца спн.Пятроўская.

Пачалося ўсё з затрыманьня аднаго з актывістаў «Моладзі БНФ» Міколы Якушава. Праграма перабываньня ў Слуцку была шчыльная — наведаньне краязнаўчага музэю, невялічкі канцэрт ў гарадзкім парку з удзелам колішняй пераможцы «Бардаўскай восені» Тацяны Беланогай ды раздача друкаванай прадукцыі. Падчас апошняй Мікола і папаўся. І хоць ён толькі здымаў акцыю на відэа, менавіта на яго склалі пратакол, зьвінаваціўшы ў распаўсюдзе незарэгістраванай друкаванай прадукцыі. Затрыманых случакоў Паўла Філіпенку і Віталя Амяльковіча адпусьцілі неўзабаве без складаньня пратаколаў.

Арганізатар экскурсіі Франак Вячорка хацеў зрабіць небанальную акцыю — бязь лішняй гаварыльні і звыклых лёзунгаў. А першачарговымі задачамі вандроўкі ён лічыць выхаваўчую і інфармацыйную. Паездка была арганізаваная адмыслова для маладзейшых сяброў арганізацыі: «Трэба ўздымаць культурны і палітычны ўзровень і сярод нашых сяброў таксама. А Дзень герояў — добрая для таго нагода». Другой нагодай было інфармаваньне насельніцтва. На вуліцах Слуцку і на гарадзкім рынку маладзёны раздалі паўтары тысячы прысьвечаных Слуцкаму паўстаньню буклетаў і амаль столькі ж недзяржаўных газэтаў ды праваабарончых бюлетэняў. Асабліва ахвотна разьбіралі газэты на рынку. Гэты ажыятаж, мабыць, і ўзнэрваваў мясцовую міліцыю.

Першымі да аўтобуса прыехалі даішнікі, якія задалі арганізатару некалькі дзіўных пытаньняў: што рабілі ў музэі, навошта гітары і чаму гаворым па-беларуску. Потым у прысутнасьці супрацоўніка ў цывільным міліцыянты перапісалі дадзеныя ўдзельнікаў вандроўкі нібыта з тым, каб высьветліць, ці няма сярод іх нелегалаў.

На гэтым прыгоды ня скончыліся. Каб трапіць у Семежава, дзе пастаўлены крыж у памяць аб слуцкіх паўстанцах, давялося гадзіну прастаяць на мяжы з Капыльскім раёнам у чаканьні начальніка капыльскай міліцыі. Той дазволіў ускладаньне кветак, запальваньне зьнічак і гімн «Магутны Божа». «Толькі не заклікайце ні да чога ды не разгортвайце забароненага», — настойліва параіў таварыш маёр.

У Семежаве ўдзельнікі акцыі нечакана ацанілі міліцэйскі клопат — паўсотні запаленых зьнічак вакол памятнага крыжа, які мясцовыя жыхары клапатліва даглядаюць, выглядалі сярод цемры фантастычна ўрачыста. Мінакі, якіх на вуліцы Семежава было нават шмат, як на такі час, сьцішана перамаўляліся.

Бард Аляксандар Галіч, які па дарозе зь Менску апавядаў пра слаўную гісторыю Случчыны, кажа пра фэномэн гэтага краю: «Людзі тут не развучыліся шанаваць сьвятое, нават улады з гэтым мусяць лічыцца».

Вярталіся ў Менск увечары ў суправаджэньні міліцыі. На мяжы з чарговым раёнам пад патрыятычныя сьпевы чакалі міліцэйскае начальства. Падчас чарговага прыпынку, яшчэ ў Слуцкім раёне, моладзь прыняла прысягу на вернасьць Беларусі. Проста пасярод дарогі, асьветленай міргаўкамі даішнага легкавіка, пад бел-чырвона-белым сьцягам.

**Сямён Печанко**



ІГАР КРАШЭЎСКІ

# Суцэльныя непрыемнасьці,

Водгукі на публікацыі на інтэрнэт-старонцы «Нашай Нівы» даволі хутка надакучвае чытаць. Піша **Віталь Тарас**.

## Дурні ў бібліятэцы

Мой бацька прызвычаіўся друкаваць свае тэксты на пішучай машынцы. Шмат дзесяцігодзьдзяў нямецкая, яшчэ гэдээраўская «Эрыка» служыла яму верай і праўдай. Калі яна ламалася, бацька аддаваў яе майстру, і той рамантаваў яе за невялікую плату. Нядаўна яна зламалася чарговы раз, і цяпер гэта абярнулася сапраўднай драмай. Раптам выявілася, што не засталося ўжо майстроў, якія рамантуюць машынкі. А калі б нехта й узяўся б — усё адно няма запчастак. Нават стужкі для машынак даўно ўжо не выпускаюць. Некаму сытуацыя можа падацца сьмешнай. Вось дзівак — друкаваў бы на кампутары, якія праблемы?

Для некаторых людзей гадоў майго бацькі трагедыі сапраўды няма. Яны асвоілі і кампутар, і электронную пошту, і з Інтэрнэтам даўно на «ты». Але для майго бацькі, у якога зь дзяцінства былі праблемы зь любой тэхнікай (рыса, якую, на жаль, атрымаў у спадчыну і я), гэтая задача аказалася не пад сілу. Кампутар яго ня слухаецца, пачынае «глючыць» і капрызіць, як толькі бацька да яго падыходзіць (здаецца, фізыкі калісь назвалі гэта «сындромам Паўлі». Кажуць, як толькі выдатны нямецкі тэарэтык Паўлі ўваходзіў у экспэрымэнтальную лябараторыю, дык адразу ўсе прыборы там ламаліся).

Тым ня менш, навінамі, якія зьяўляюцца ў Інтэрнэце, на грамадзка-палітычных сайтах, бацька жыва цікавіцца, просіць для яго раздрукоўваць публікацыі. І ўсё ж да Інтэрнэту як зьявы ён ставіцца зь вялікім падазрэньнем (як, дарэчы, і выдатны пісьменьнік-фантаст Станіслаў Лем, які папярэджваў, што Інтэрнэт прынясе чалавецтву непрыемнасьці, у параўнаньні зь якімі ядзерная катастрофа падасца дзіцячай гульнёй).

Асаблівы недавер і іронію выклікаюць у майго бацькі звыклыя параўнаньні Інтэрнэту са своесаблівай гіганцкай бібліятэкай, дзе захоўваюцца амаль усе сучасныя веды (прычым сусьветная літаратура займае досыць невялікую частку гэтых ведаў). На ягоную думку, невук альбо дурань, якога пусьцілі раптам у бібліятэку Кангрэсу, не перастане быць ад гэтага невукам альбо дурнем. А чалавек, у якога ёсьць думкі, можа данесьці іх да сьвету неабавязкова праз пасярэдніцтва глябальнага Сеціва. Галоўная ўмова — каб яны былі.

І тут, рызыкуючы падацца безнадзейным рэтраградам, я мушу пагадзіцца з маім бацькам. Найвялікшая вынаходка апошняй трэціны мінулага стагодзьдзя — Інтэрнэт — дагэтуль не прынесла людзям ані сапраўдных ведаў, ані шчасьця. Як не прынесьлі яго перад тым, карыстаючыся словамі Ільфа й Пятова, прымус і аўтаручка.

## «Пакаленьне геймэраў»

Хай сучасныя маладзёны, якіх ужо назвалі «пакаленьнем геймэраў», раней асвойваюць кампутар, чым ровар (калі ўвогуле яго асвойваюць), і маюць хуткую рэакцыю, натрэніраваную ўдумлівай гульнёй у «Дум». Гэта не азначае, што яны ўсе навучыліся думаць ці хаця б чытаць і пісаць. Асабліва пісаць. Я ня маю на ўвазе «падонкаўскую мову», прыдуманую групай юных геніяў расейскага ЖЖ («Превед, Медвед!», «Аффтар жжот!» і «Аффтар, выпей йаду» зрабіліся неад’емнай часткай жывой мовы ў Сеціве). У параўнаньні з мовай пераважнай большасьці чатаў і форумаў на ўсіх без выключэньня сайтах мова «падонкаў» выглядае ўзорам прыгожага пісьменства.

Перапіска на форумах мне асабіста больш за ўсё нагадвае «графіці» ў грамадзкіх прыбіральнях, дзе фантазія і сьмеласьць ананімных аўтараў насьценных надпісаў абмежаваная неразьвітым густам і мізэрным наборам моўных сродкаў.

Справа ў тым — і аб гэтым папярэджваў Лем, — што ўся summa tehnologiae Зямлі ёсьць ня чым іншым, як усяго толькі мыліцамі для чалавецтва, свайго роду ягонымі пратэзамі. Калі патрэбныя больш сучасныя аналёгіі — калі ласка, можна ўспомніць мэханічныя маніпулятары, з дапамогай якіх працуюць, напрыклад, з радыеактыўнымі дэталямі ў адмысловых боксах. Калі чалавек ня ўмее граць на фартэпіяна, дык гэтыя маніпулятары яму нічым не дапамогуць. А калі ідыёту даць у рукі мікрафон… Самі ведаеце, што з гэтага выйшла.

Так, Інтэрнэт ня можа замяніць сабой камунікаваньне паміж людзьмі, якія ня ўмеюць і ня любяць камунікаваць з да сябе падобнымі. Інтэрнэт дае магчымасьць імітацыі чалавечай камунікацыі, чагосьці накшталт «ананімнага сэксу» замест каханьня. Не выпадкова пераважную частку Сеціва складаюць парнасайты і блогі.

Зразумела, ўсё сказанае пакуль у найменшай ступені тычыцца беларускага Інтэрнэту — дакладней, беларускамоўнае яго часткі. Для таго каб у наш час карыстацца беларускай мовай у Сеціве, трэба як мінімум ведаць яе хаця б у аб’ёме пачатковых клясаў, а па-другое — імкнуцца да чагосьці, што не ўваходзіць у сучасны стандартны набор матэрыяльных выгодаў.

Дарэчы, менавіта «пакаленьне геймэраў» у Беларусі ўспрыняло сёлета ў сакавіку маральны імпэратыў усур’ёз і выйшла пасьля выбараў на Плошчу, рашуча адарваўшыся ад крэслаў ля кампутараў.

## Немаўля ў пустыні

Зразумела, і валоданьне беларускай мовай таксама яшчэ ня робіць чалавека адукаваным, інтэлектуальным ці хаця б ветлівым і прыстойным. Водгукі на публікацыі на інтэрнэт-старонцы «Нашай Нівы», як правіла, даволі хутка надакучвае чытаць. І не таму,

# альбо Антыапалёгія Інтэрнэту

што ўдзельнікі дыскусіі амаль адразу забываюцца на прадмет гутаркі і зь лёгкасьцю пераскокваюць з аднае тэмы на іншую. А таму, што, як правіла, іх увогуле не цікавяць нічые думкі, акрамя ўласных (хаця многія аўтары, дзеля адсутнасьці ўяўленьня аб лёгіцы, за думку прымаюць меркаваньне ці проста сьцьверджаньне). Далёка не ва ўсіх спрэчках нараджаюцца ісьціны. Ананімны водгук у Інтэрнэце, як і надпіс у прыбіральні, мае на мэце зусім не высьвятленьне, хто мае рацыю, а хто не. Іхная супольная мэта — самасьцьвярджэньне любой цаной. За кошт блізкага, зразумела.

Вось нехта Litvin (наколькі можна меркаваць, ён жа — Язэп Сыч) піша, што ён ніколі ня будзе называць сябе прыніжальным словам «беларус», як ня будзе называць роднае Літвы «Беларусьсю». Бо гэта, на ягоную думку, рабскае слова і ўсе, хто ім карыстаецца, — рабы альбо калябаранты. Гісторыя Літвы, натуральна, канчаецца XVII стагодзьдзем, пасьля чаго пачынаецца гісторыя акупацыі Бацькаўшчыны. (Я наўмысна ўтрырую і аб’ядноўваю розныя выказваньні розных аўтараў у адну тэзу, паколькі не зьбіраюся зь імі спрачацца — гэтыя выказваньні, спатрэбіліся мне толькі дзеля ілюстрацыі.) Такім чынам, у гісторыі не застаецца месца ні для БНР, ні для беларусізацыі, ні для Інбелкульту, ні для беларускіх акадэмікаў ці пісьменьнікаў (асабліва тых, хто загінуў у гады сусьветнай вайны ад нямецкіх куль, — бо акупацыя ж, паводле азначэньня, можа быць толькі расейская). Нікога й нічога не было — ні ў XIX стагодзьдзі, ні ў дваццатым. Чаго зьдзіўляцца, што і 100-годзьдзе «Нашай Нівы» прайшло амаль нікім не заўважаным.

Не было нічога добрага, вядома, і ў Рэспубліцы Беларусі на пачатку 1990-х гадоў, паколькі не было інтэлігенцыі, а кіраўніцтва Саюзу пісьменьнікаў Беларусі было «самым згодніцкім» (гэта ўжо з выказваньняў Андрэя Дынька). Не гісторыя, а суцэльная культурніцкая пустыня. Nihil.

І толькі аднаму пакаленьню — сучаснаму, іншымі словамі — «сабе, любімым», робяць выключэньне аўтары падобных інвэктываў. Нехта даўно заўважыў парадокс: няма нічога больш аднастайнага і кансэрватыўнага ў літаратуры і мастацтве за авангард. Кожнага разу новае пакаленьне «мадэрністаў» скідвае з «парахода сучаснасьці» Байрана, Пушкіна, Багушэвіча, Коласа з Купалам, Быкава. (Дарэчы, Быкаў, як бы на гэтым ні настойваў адзін зь віртуальных наведнікаў «Нашай Нівы», ніколі не называў беларусаў «тупаватымі». Тыповы беларускі пэрсанаж Рыбак — здраднік, але ён зусім не тупы, у тым і трагедыя.)

Пачынаць кожнага разу зь сябе, то бок з нуля, са сваёй уласнай творчасьці, быццам нікога і нічога вартага ўвагі не было да цябе на зямлі, — гэта рыса, тлумачальная і даравальная ў падлетка. Дзіцячы нэгатывізм. У пераходным узросьце, як вядома, найбольш цэніцца фізычная сіла, а не інтэлект. Асаблівасьць нашага часу палягае ў тым, што пад сілай разумеюцца ўжо ня толькі мускулы, але і ўменьне карыстацца «маніпулятарамі» — напрыклад, тым самым Інтэрнэтам. Любая нацыя праходзіць праз хваробу росту.

Вось толькі хвароба зацягнулася. Біцэпсы і нават другасныя палавыя прыкметы ўжо зьявіліся, а твар — як у немаўляці, якому не даюць цукеркі.



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЗЎСКАГА

# Фафудзьдзя захапіла ўкраінскі Інтэрнэт

Палова Ўкраіны сёньня задаецца пытаньнем: што такое фафудзьдзя? Гэтая зьява літаральна за некалькі месяцаў захапіла ўкраінскае грамадзтва.

«Добры дзень, я з Херсонскай вобласьці, расеец па нацыянальнасьці. Маёй дачцэ ў школе забаранілі насіць такі атрыбут расейскай культуры, як фафудзьдзю. Аргумэнтавалі гэта тым, што дзяржаўная мова — украінская. Хачу запытаць, Пётар Мікалаевіч: ДОКОЛЕ?» На такое пытаньне быў вымушаны адказваць у інтэрнэтчаце лідэр украінскіх камуністаў Пятро Сіманенка. З таго моманту ўкраінскі інтэрнэт захапляецца гульнёй у «фафудзьдзю», па папулярнасьці параўнальнай хіба зь нядаўнім захапленьнем «падонкаўскай мовай» і «мядзьведам» у расейскамоўным Сеціве.

Суполка «Фафудзьдзя», што ўзьнікла сярод карыстальнікаў «Жывога журналу», у сваіх тэкстах і дыялёгах мадэлюе нібыта ідэальны імпэрскі й чарнасоценны «ісьціннарускі» ды «ісьцінправаслаўны» сьвет, дзе ўкраінская мова — усяго толькі дыялект расейскай (дый ангельская толькі «так сказаць, язык»), а згадка пра незалежнасьць ад Расеі абавязкова суправаджаецца выразам «цур мяне». Ключавыя панаткі «фафудзізму» — сама «фафудзьдзя», «доколе?!» (заклік-пратэст супраць прыцясьненьняў з боку «юшчанка-масонскае» ўлады), «бярдыш» (ісьцінаруская зброя) і г.д.

«Фафудзьдзя» гуляе на шавіністычных ды каляніяльных стэрэатыпах.. Так, «фафудзісты» ўвесь час прабачаюцца за выкарыстаньне «жыдабандэраўскай клявіятуры» (для гэтага існуе скарачэньне І.З.І.Ж.Б.К. — «ізвінітє за іспользованіє жидобандеровской клавіатуры») альбо за тое, што вымушаныя пісаць эсэмэскі «натаўскімі літарамі». Расейскамоўныя ж тэксты там пішуцца з адмыслова выдзеленымі «яцямі» і «ерамі»: «Если доведется вамЪ, братия и сестры мои, посещать чужбину богомерзскую (ИЗТ), то знайте, что есть тамЪ только одна каноническая и богоугодная сеть отелей гостиницЪ — это РитЪцЪ-КарлЪтонЪ. Дабы натовцы не раскусили истинно русских людей (ИЗТ), сеящих единственно верное православие (ИЗТ) среди супостатов неразумныхЪ (ИЗТ) на чужбине, послание о канонической сети отелей гостиницЪ пришло к намЪ в песне на непонятномЪ английском, так сказать, языке (ИЗМТ)». («ИЗТ». — «прабачце за таўталёгію»).

Ёсьць ва Ўкраіне і аматары традыцыйнага «вока за вока». Удзельнікі ўкраінскай «livejournal»-суполкі «Расея, якая шакуе» заяўляюць, што ў адказ на антыўкраінскі піяр у расейскіх СМІ яны адбіваюцца сваім ударам. У суполцы адразу папярэджваюць, што не распальваюць міжнацыянальнай варажнечы, бо «яна ўжо даўно распаленая», і жорстка выкрываюць расейскія недахопы. Сваімі падыходамі гэтая старонка нагадвае «Беларускую жабу». Толькі што www.belzhaba.com засяроджаная на ўнутрыпалітычных праблемах краіны.




Во так увасабляецца Купалаў заклік «людзьмі звацца» на сучаснай постсавецкай прасторы. Украінскае інтэрнэт-пакаленьне, якое вырасла за незалежнасьцю ва ўмовах павагі да нацыянальных каштоўнасьцяў, не разумее, чаму мусіць мірыцца з шавінізмам і сьцьвярджэньнем расейскае вышэйшасьці. Яму не падабаюцца песьні Газманава. Толькі «фафудзісты», замест таго каб палемізаваць на інтэрнэт-форумах, пачалі тыя песьні высьмейваць. Дзеці, як заўжды, разумнейшыя за бацькоў.

**Зьміцер Панкавец**

**Фафудзьдзя —**

бізантыйская каштоўная тканіна, зь якой рабілася вопратка базылеўсаў, а таксама вопратка з такой тканіны. Пазьней моду на фафудзьдзю перанялі усходнеславянскія князі. Паводле летапісаў, кесар Леў у 912 зрабіў Алегавым паслам дары «золатам, і павалокамі, і фафудзьямі». У XII ст. фафудзьдзя саступіла месца новай моддзе — аксаміту.

**У Інтэрнэце:**

http://community.livejournal.com/fofudja/profile

http://community.livejournal.com/shocking_rasha/profile

# Бураўкін сабраў аншляг

Сямідзесяцігодзьдзе Генадзь Бураўкін адсьвяткаваў яшчэ 28 жніўня. Юбілейная ж імпрэза адбылася толькі 30 лістапада. І да апошніх гадзінаў не было вядома, ці ўвогуле яна адбудзецца.

Раніцай зьявілася інфармацыя: адміністрацыя Палацу мастацтваў адмовіла арганізатарам вечарыны у памяшканьні. Тлумачылася гэта традыцыйнымі тэхнічнымі праблемамі: нібыта ў залі мелі адключыць сьвятло. Сьпехам разглядаліся іншыя варыянты. Свайго былога старшыню было гатовае прыняць Таварыства беларускай мовы, але ўрэшце адказныя чыноўнікі далі дазвол, і вечарына прайшла там, дзе было заплянавана.

Няпэўнасьць ня зьменшыла колькасьці гледачоў. Усім прысутным не хапіла крэслаў. А на вечарыну прыйшлі ў асноўным людзі старэйшага веку: тыя, хто з імем Бураўкіна зьвязвае росквіт часопісу «Маладосьць» у 70-я, беларусізацыю тэлебачаньня ў 80-я. У глыбіні залі быў заўважаны і кандыдат у прэзыдэнты-2001 Уладзімер Ганчарык.

Першай юбіляра павіншавала — урыўкам з «Хатынскай аповесьці» — народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч. Пасьля кіраваньне імпрэзай узяла народная артыстка і культавая тэлевядучая Зінаіда Бандарэнка.

Даўні сябар Бураўкіна народны паэт Рыгор Барадулін чытаў верш з прысьвячэньнем гаспадару імпрэзы, а пры канцы выступу гукнуў: «Жыве Беларусь!» Пасьля гаварыў старшыня Саюзу беларускіх пісьменьнікаў Алесь Пашкевіч, паэт Анатоль Вярцінскі. Сяргей Далідовіч падарыў юбіляру слоічак адборных лагойскіх баравічкоў. Радзім Гарэцкі, адгукаючыся на нашаніўскую дыскусію, сказаў: сёньня няма больш годнай кандыдатуры на званьне народнага пісьменьніка Беларусі, чым Генадзь Бураўкін.

Павіталі Бураўкіна пробашч касьцёлу сьвятых Сымона і Алены Ўладзіслаў Завальнюк, рэжысэр Валеры Мазынскі. Цёплыя словы казалі колішнія калегі спадара Генадзя па працы на тэлебачаньні.

Эфэктным быў выхад на сцэну прадстаўнікоў Саюзу мастакоў на чале са старшынём Уладзімерам Басалыгам. Патрыярхі мастацкага цэху Леанід Шчамялёў, Васіль Шаранговіч, Гаўрыла Вашчанка падарылі Бураўкіну свае карціны і кветкі.

З музычнай часткі «жыўцом» змаглі выступіць толькі артысты опэры. «Пясьняр» Леанід Барткевіч мусіў тэрмінова ехаць на канцэрт у Маскву, але перадаў свае шчырыя віншаваньні юбіляру ў запісе. Ядзьвіга Паплаўская і Аляксандар Ціхановіч ад удзелу ў імпрэзе адмовіліся, таму прысутныя паслухалі адно фанаграмы іх сьпеваў на вершы Бураўкіна.

А сам юбіляр чытаў новыя вершы пра наш час. Вось адзін зь іх:

У подлы час няпроста быць няподлым,
Ісьці сваёю цьвёрдаю ступой,
Калі ня верац
Ні сьлязам,
Ні модлам
І гнуцца перад сілаю тупой.

Адкрыты шлях
Махлярству і халуйству,
Аддадзены махлярству рубяжы:
Як хочаш мець заўсёды хлеба лусту,
Дык пяты ўсім начальнікам ліжы.

Але трывай,
У гневе зубы сьцяўшы,
Не пакідай апошні свой акоп,
Як ні было б пакутліва і цяжка,
Як скрушліва і крыўдна ні было б.

**Зьміцер Панкавец**

**Мастакі з падарункамі Бураўкіну. Першы зьлева старшыня Саюзу мастакоў Уладзімер Басалыга, дбаньнямі якога адбылася-такі гэтая вечарына.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Гэтая зіма будзе самай цёплай

Паводле слоў кіраўніка Гідрамэтцэнтру Расеі Рамана Вільфанда апошнія тры гады сярэдняя тэмпература паветра зімой на зямным шары павышаецца — прыблізна на 0,9—1,3 градуса ў год. Р.Вільфанд запэўніў, што сярэдняя тэмпература гэтай зімой будзе вышэйшай ня толькі за леташнюю, але і за норму на 3—4 градусы.

Зямля за апошнія паўмільёна гадоў перажыла ўжо чатыры пэрыяды пахаладаньня й пацяпленьня.

**Паводле «Звязды»**

## У Магілёве гадзіну лунаў бел-чырвона-белы сьцяг

3 сьнежня ў Магілёве ў раёне Савецкай плошчы, на пешаходным мосьце, зьявіўся бел-чырвона-белы сьцяг. Сьцяг правісеў 50 хвілінаў, пасьля чаго супрацоўнікі ДАІ прыбралі палотнішча.

**Паводле радыё «Рацыя»**

## Нашым дзецям няма роўных

10-гадовы мазырчук Андрэй Кунец зь песьняй «Новы дзень» заняў другое месца на 4-м дзіцячым конкурсе песьні «Эўрабачаньне-2006». Конкурс прайшоў 2 сьнежня ў румынскай сталіцы Бухарэсьце. Найбольшую адзнаку, 12 балаў, Андрэю паставілі гледачы Расеі, Мальты і Партугаліі. 10 балаў далі ўкраінцы, румыны і швэды.

Першае ж месца, апярэдзіўшы Андрэя на 25 балаў, занялі сёстры-блізьняткі з Расеі Маша і Насьця Талмачовы. Узнагароду конкурсу яны атрымалі з рук пераможцы леташняга «Эўрабачаньня» беларусачкі Ксені Сітнік.

Беларускія гледачы аддалі найвышэйшыя балы канкурсантам з Расеі (12) ды Швэцыі (10).

У Беларусі надта пякуцца пра перамогі на тым конкурсе, у «Эўропе» ж ён ня дужа знаны.

**Выніковая табліца дзіцячага конкурсу «Эўрабачаньне-2006»**

1. Расея — 154 балы:
2. Беларусь —129
3. Швэцыя — 116
4. Гішпанія — 90
5. Сэрбія — 81
6. Румынія — 80
7. Бэльгія — 71
8. Украіна — 58
8. Кіпр — 58
10. Харватыя — 50
11. Мальта — 48
12. Нідэрлянды — 44
13. Грэцыя — 35
14. Партугалія — 22
15. Македонія — 14

**АГ**


KUNETS.COM

**Андрэй Кунец з мамай Сьвятланай.**


WWW.RADZIMA.ORG

## Мэр Менску загадаў зьнізіць энэргаспажываньне

Старшыня Менгарвыканкаму Міхаіл Паўлаў даручыў распрацаваць праграму па зьніжэньні ў 2007 г. энэргаспажываньня на 10%. «Пры гэтым зьмяншэньня ў такім аб'ёме павінны дасягнуць усе суб'екты гаспадараньня незалежна ад формы ўласнасьці», — сказаў ён на паседжаньні выканкаму.

**Паводле БелТА**

## Цана літоўскіх візаў ня зьменіцца

Пакуль Літва не далучыцца да Шэнгенскага пагадненьня, захаваецца цяперашняя стаўка консульскіх збораў за выдачу візаў: 5 эўра — за аднаразовую і 25 эўра — за шматразовую. Раней плянавалася, што Літва далучыцца да Шэнгенскага пагадненьня ў кастрычніку 2007 г. Аднак пасьля саміту ў Фінляндыі стала вядома, што ўваход у шэнгенскую зону адкладаецца.

**АК**

## Пераасьвячаны касьцёл у Радашкавічах

У нядзелю 3 сьнежня біскуп Антоні Дзям'янка зьдзейсьніў урачыстую рэкансэкрацыю касьцёлу Найсьвяцейшай Тройцы ў Радашкавічах, дзе некалі хрысьцілі Янку Купалу. Касьцёл быў фундаваны яшчэ ў 1447 г. Цяперашні будынак пачалі мураваць у 1855 г. У 1946-м **касьцёл (на фота)** прыстасавалі пад цэх заводу «Беларуская кераміка». Сёньня пробашчам у Радашкавічах ксёндз Валянцін Станкевіч.

**Паводле «Catholic.by»**

## Выйшаў расейска-беларускі слоўнік мовы жэстаў

«Беларускае таварыства глухіх» прымеркавала да Дня інвалідаў выданьне расейска-беларускага слоўніка мовы жэстаў. У дапаможніку 5 тысяч словаў, яго наклад 2 тысячы асобнікаў. Жэсты пададзены з гледзішча абедзь-

вюх моваў. Мерапрыемствы, прысьвечаныя Дню інвалідаў, працягнуцца ў Гомельскай вобласьці да сярэдзіны сьнежня.

**Алеся Пабегава**

## Малафееў вярнуўся

У аўторак адбылося прызначэньне новага галоўнага трэнэра футбольнага клюбу МТЗ-РІПА. Пасьля сыходу Юр'я Пунтуса, трэнэра нацыянальнай зборнай, пасада кіраўніка каманды была вакантнай. Новым коўчам трактаразаводцаў нечакана стаў знакаміты Эдуард Малафееў, які не прыжыўся ў шатляндзкім «Хартсе» (Эдынбург).

**Зьміцер Панкавец**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## У Баўгарыі правыя рыхтуюць рэванш

Найпапулярнейшы баўгарскі палітык, мэр Сафіі Бойка Барысаў афіцыйна абвесьціў у нядзелю пра стварэньне новай партыі, якая атрымала падтрымку амаль паловы грамадзтва яшчэ да таго, як узьнікла.

«Грамадзяне за эўрапейскае разьвіцьцё Баўгарыі» (GERB), паводле слоў Барысава, — правая партыя, якая аб'яднае цэнтраправіцу, апошнія гады раздробленую.

**ВД**

## Племя мапучу супраць «Windows»

Племя індзейцаў мапучу, якое жыве ў Чылі, падае ў суд на «Майкрасофт» за выпуск вэрсіі «Ўіндаўз» на іх роднай мове — мапузугун. У племі лічаць, што «Майкрасофт» парушыла іх культурную і грамадзкую спадчыну, калі пераклала сваё праграмнае забесьпячэньне, не параіўшыся з носьбітамі мовы.

На мове гаворыць 400 тысяч чалавек, пераважна на поўдні Чылі. На прэзэнтацыі прадстаўнік «Майкрасофту» сказаў, што кампанія хоча дапамагчы мапучу ўвайсьці ў лічбавае стагодзьдзе і «адчыніць акно для сьвету да сваёй культурнай спадчыны».

Мова мапучу — ня першая карэнная амэрыканская мова, на якую перакладзеныя праграмы «Майкрасофту». «Ўіндаўз» выпускаецца на мовах махаўк, квехуа й інуктытут.

Індзейцы мяркуюць, што ўрад Чылі, які падтрымаў праект, мусіць зрабіць мапузугун дзяржаўнай мовай разам з гішпанскай, але ўсе рашэньні датычна мовы мусяць узгадняцца зь яе носьбітамі.

**Паводле «Bybanner.com»**



## Мова малюнкаў «zlango» заменіць SMS

Гіерогліфы для мабільных тэлефонаў вынайдзеныя ў Ізраілі. Хутка «zlango» пашырыцца і на іншыя краіны.

«Zlango» нескладаная для вывучэньня. Дастаткова гадзіны, каб засвоіць значэньне іконак.

Назва «zlango» пачынаецца з «Z», у гонар нашага земляка зь Беластоку Людвіка Замэнгофа — вынаходніка эспэранта.

**Вольга Данішэвіч**

## Анатолю Вярцінскаму — 75

18 лістапада споўнілася 75 гадоў паэту **Анатолю Вярцінскаму (на фота зьверху)**. «НН» пісала пра гэта на сайце, а ў папяровай газэце інфармацыя ў юбілейнай тармасе зрэзалася. Але добрыя словы напісаць ніколі ня позна.

Паэт нарадзіўся ў 1931 годзе ў вёсцы Дзямешкава на Лепельшчыне. За часамі ягонага рэдактарства ў 1986—1990 гадах газэта «Літаратура і мастацтва» дасягнула вяршыняў папулярнасьці. Прыроджаны талент далікатнага арганізатара Вярцінскага згуртаваў у тым выданьні найлепшыя творчыя сілы, сярод якіх і цяперашнія аўтары «НН». Вярцінскі-рэдактар быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савету. Аднак перадусім ён заўжды быў паэт. І ім застаецца да гэтых дзён.

Рэдакцыя «НН» апошняй далучаецца да віншаваньняў юбіляру.

**Зьміцер Панкавец**

## Дарожка



Палац, Новая музыкальная компания, 2006.

Тады ў складзе гурту былі Выдронак і Вайцюшкевіч, а падпявала Круглова.

Гурт «Палац» працягвае перавыдаваць сваю спадчыну. У продажы зьявілася самая недаацэненая праграма Хаменкі і кампаніі — «Дарожка». Тады, у 1996 г., у складзе гурту былі і Юры Выдронак, і Зьміцер Вайцюшкевіч, падпявалі Вераніка Круглова і басіст легендарнага «Сузор’я» Аляксей Казлоўскі. На «Дарожцы» — уся палацаўская смаката. Тут і фольк-рок «Борам», «А ці дома» (гэты шлях «Палац» абярэ надалей), і псыхадэлічныя фольк-электронныя экспэрымэнты («Дарожка», «Казачэнька»), і намаганьне спалучыць беларускую і сусьветную музычную тэндэнцыі (ангельскамоўныя чытанкі Казлоўскага і галашэньне Кругловай у *Freeze to me, mama*). А ў «Казачэнькі» музыкі скарысталі старажытнае танга «Дона Кляра» і голас Гітлера. Ёсьць і зусім не характэрная для «Палацу» індзейская песьня *Came Out of the Wilderness*, сугучная з *Pink Floyd*. Менавіта іх пірацкі варыянт увайшоў калісь на скандальны відэафільм «Незвычайны канцэрт». А вось кранальная песьня «Вецер», якую пасьля Алег Хаменка прысьвяціў Стэфаніі Станюце. На «Дарожцы» час не адбіўся, гэты альбом гучыць абсалютна актуальна ў 2006 г. Для 1996 г. ён быў занадта сьмелы. «Дарожку» можна ўключыць у асноўныя здабыткі беларускай сучаснай музыкі.

## Это всё любовь моя



Тарыел Майсурадзэ, кампанія «Проспект», 2006.

Млосна, але ад душы.

Ненавязьлівы поп для тых, каму за 30, ад былога музычнага дырэктара адной зь менскіх FM-станцый. Кіруючы, уласна, камэрцыйнай радыёстанцыяй, нічога іншага не прыдумаеш — стандартызаваны мужчынскі поп, крыху лепей за Саладуху, але значна горш за Робі Ўільямза. Цікава, што сьпявае ён ужо другі дзясятак гадоў, а на выпуск дыску і на сольны канцэрт наважыўся толькі сёлета.

Упікнуць сьпевака ў няшчырасьці цяжка. Вось пачуеш часам якога шансаньне — млосна сьпявае, але бачна: ад душы. Так і з Майсурадзэ. Асаблівя гэта бачна ў іншамоўных песьнях альбому. Расхінаецца душа артыста, калі ён сьпявае на роднай, відаць, для сябе мове «Мерцхало» («Ляці, ластаўка») і па-беларуску (поп-баляда «Нелюдзімая»). У прынцыпе, калі пераважная частка нашых папсавікоў знаходзіцца яшчэ ў 80-х, то Майсурадзэ ўжо ў 90-х.

## Джамбібум



Джамбібум, 2006, самвыдаў.

«Джамбібум» намагаецца ўзяць і якасьцю, і колькасьцю адначасова.

Не вядзецеся, нічога супольнага з «Бум-Бам-Літам» гэты праект ня мае. Гэта дэбютны дыск чарговых прадстаўнікоў фольк-мадэрну. Фольк ад «Джамбібум» — чысты, без электронных апрацовак: акустычная гітара, флейта, скрыпка. Музыка крыху афрыканізаваная з дапамогай ударных інструмэнтаў. Асаблівых адкрыцьцяў альбом не нясе, але і не расчароўвае. Годна выканана, як з вакальнага, так і музычнага гледзішча. Рэшта вядомых фольк-стандартаў — такіх, як «Туман ярам» (ці інакш — «За туманам») і «Ружа-кветка», — дапаўняецца ўласнымі імправізацыямі на тэму беларуска-афрыканскай музычнай лучнасьці. Пераважна гучыць «Джамбібум» як «Крыві» ў свае лепшыя часы, голаса Вайцюшкевіча толькі не стае. Гурт можа ўпрыгожыць сваім удзелам як афіцыёзныя мерапрыемствы, кшталту «Гуляй, душа», так і альтэрнатыўныя музычныя фэсты. Ёсьць у іх у меру і ад «Бяседы», і ад «Тройцы». Цікава тое, што гурт Кірчука добра ўпраўляецца ўтрох, а «Джамбібум» намагаецца ўзяць і якасьцю, і колькасьцю адначасова — у праекце больш за дзясятак удзельнікаў. У выніку ў некаторых песьнях ствараецца адмысловы музычны вэрхал, шматгалосьсе і шматгучча. Добра пад такую музыку прачынацца, адразу прыводзіць у працоўную кандыцыю. Рэкамэндуецца для праслухоўваньня ўсім, без узроставых абмежаваньняў.

## Беларусачка



Анжаліка Агурбаш, Vigma, 2006

Настальгічна.

Зважаць на безгустоўнае аздабленьне ня варта. Беларускамоўны дыск грамадзянкі Расеі — прадукт якасны і прэзэнтабэльны. Агурбаш-Ялінская крыху не дацягвае да той ролі, якую выконвае Верка Сярдзючка для Украіны, але папулярызаваць беларускую песьню на постсавецкіх яна здолее. Падборка песень — звышпапсовая. І гэта добра: «Касіў Ясь», «Я ж цябе падманула», «Купалінка» запамінальныя і добра вязнуць на вушах тых, хто ня ёсьць носьбітам беларускай мовы. Значыць, адну функцыю дыск пасьпяхова выконвае. Другая частка праграмы — песьні, якія тады яшчэ Ліка Ялінская сьпявала ў пару «Верасоў», калі для яе штатным парадкам пісалі Ўладзімер Някляеў і Леанід Пранчак. «Раз ды разок», «Белае віно ды чырвонае», «Малады ды нежанаты» — для настальгуючых па сьветлым часе беларускай эстрады, калі галоўны дырыжор краіны вітаўся з усімі словамі «Жыве Беларусь!», а эстраднікі стваралі цэлыя цыклі песень на тэму Адраджэньня. «Уздымем горда бел-чырвона-белы сьцяг», — гэта запеў зь песьні «Наўздагон» той жа Ялінскай, што, відаць, з прычын карэктнасьці ня трапіла ў гэты альбом. Урэшце, ёсьць на «Беларусачцы» і абсалютны сьвяжак, створаны Агурбаш ужо за маскоўскім жыцьцём. Як песьня «Вянок» на верш таго ж Някляева. Прафэсійна аранжавана, чысьценька запісана, з увагай на бэк-вакалы і малазаўважныя гітарныя партыі, з эмоцыяй і пачуцьцём прасьпявана.

**Сяргей Будкін**

**На дварэ стаіць зіма,**
**Ежы у зьвяроў няма.**



**Моркаўку дамо ласю —**
**Струшчыць ён яе усю.**

**Кілбасы дамо сабачку —**
**За яе ён нам аддзячыць.**



**Птушачкам — па зернейку**
**Ды кавалак перніка!**



Капітан Танака ©

# Сустрэча герояў Плошчы

12 сьнежня а 19-й гадзіне ў сядзібе БНФ мае прайсьці пэрформанс-прэзэнтацыя кнігі «Верым! Можам! Пераможам!».

Кніга «Верым! Можам! Пераможам!» апісвае падзеі сакавіка 2006 г. вачыма шараговых удзельнікаў — тых, хто ўдзельнічаў у масавых акцыях пратэсту, пасьля будаваў намётавае мястэчка, быў арыштаваны і трапіў на Акрэсьціна. Асноўныя героі кнігі — пераважна маладыя людзі, рашучасьць і мужнасьць якіх асабліва праявіліся падчас падзеяў на Кастрычніцкай плошчы 19—23 сакавіка. Яны расказваюць пра тое, што было, як было, пра свае думкі, эмоцыі, мары. Героі кніжкі крытыкуюць і пераасэнсоўваюць.

Імпрэза зьбярэ герояў кнігі, яе ўкладальнікаў, знаных палітыкаў, музыкаў у незвычайнай атмасфэры Плошчы. Кожны зможа вярнуцца ў падзеі паўгадовай даўніны. У гэтым і будзе сутнасьць запланаванага пэрформансу.

Адмыслова на прэзэнтацыі будуць прадэманстраваныя 60 хвілін відэа бяз гуку з намётавага мястэчка: як ставілі намёты, як стаялі, як пілі гарбату і як міліцыя ўсё гэта зьнішчыла.

Прэзэнтацыя арганізаваная Культурніцкай камісіяй Партыі БНФ.




## ВЫСТАВЫ

**«NOVA TOP 40»**

У Галерэі візуальных мастацтваў «NOVA» (вул. Харужай, 16) **з 13 сьнежня** працуе выстава найлепшых фотаработ «NOVA TOP 40» з паказаных у галерэі за 1996–2006 г. Адкрыцьцё выставы **13 сьнежня а 18-й**.

**«Palangos fotoklubas» у Менску**

**З 7 да 21 сьнежня** ў кінатэатры «Перамога» (вул.Інтэрнацыянальная, 20) працуе выстава «Palangos fotoklubas» у Менску» Пяць літоўскіх аўтараў прадстаўляюць розныя работы: ад дакумэнтальнага фотарэпартажу да лірычных сюжэтаў, ад партрэтаў да пэйзажных здымкаў, што дае магчымасьць азнаямленьня з сучаснай літоўскай фатаграфіяй і яе прадстаўнікамі. Адкрыцьцё выставы **7 сьнежня а 17-й**.

## КІНО НА DVD

**«РАЙ ЦЯПЕР» («Paradise Now»)**

Драма, Палестына—Ізраіль—Нямеччына—Францыя, 2005, рэж. **Хані Абу Асад.**

У ролях: **Каіс Нашэф, Алі Суліман.**

Два палестынскія сябры атрымліваюць заданьне падарваць сябе ў Тэль-Авіве. Адзін пнецца стаць тэрарыстам, другі вагаецца... Узнагарода ад «Amnesty International», удзел у кінафэстах у Таронта і Нью-Ёрку.

**Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08**

# Першы блін для жанчын

Нядаўна выбраны старшынём сталічнай шахматнай фэдэрацыі прадпрымальнік Пётар Герасімовіч па-свойму «раскручвае» любімую гульню. Улетку спансараваў турнір для вэтэранаў, а нядаўна яму заманулася ўлагодзіць прыгожы пол. Арганізатар першага турніру сярод жаночых клюбных каманд плянаваў, што ў Менск прыедуць прынамсі сем-восем такіх камандаў; 19 лістапада ў вэстыбюлі Палацу шахмат іх сабралася… дзьве. «Ну што ж, згуляйце міжсобку матч!» — зьбянтэжана парадзіў Уладзімер Гінзбург, адказны за клюбныя спаборніцтвы ў Беларускай фэдэрацыі шахмат. Аднак гранд-дамы — чэмпіёнка Беларусі Наталя Папова, міжнародны майстар Наста Сарокіна, якая накоратка вярнулася з Аўстраліі, — паставіліся да прапановы скептычна: «Або турнір, або нічога…» Скончылася ўсё банкетам з цукеркамі.

Дзіўную пасіўнасьць патэнцыйных удзельніц сп.Гінзбург патлумачыў тым, што ім «няма куды адбірацца»: у жаночым чэмпіянаце Эўропы сярод клюбаў прымаюць усіх, абы грошы былі. А мо імпрэзу слаба разрэклямавалі? Цяжка паверыць, што ў «сінявокай» не знайшлося б 35—40 шахматыстак, гатовых утварыць адмысловыя каманды. У чэмпіянаце Беларусі выступаюць акурат чатыры тузіны жанчын і дзяўчат…

І першая ліга сёлета падзівіла, але менш непрыемна. «Ніколі не было гэтулькі моладзі — што ў жаночым, што ў мужчынскім турніры», — сказаў галоўны судзьдзя. У выніку моладзевага нашэсьця гераіня Сусьветнай алімпіяды міжнародны майстар Тацяна Бэрлін апынулася ля «разьбітага карыта». А ў Вышэйшай лізе ўвесну 2007 г. згуляюць Лана Стацко і Каця Хамякова, якім няма і 16.

У мужчынаў няўдала выступіў пераможца леташняга адборачнага этапу Ігар Люцко — 22-е месца. Гросмайстар — чалавек настрою… Першае месца заняў 25-гадовы Уладзімер Куцанкоў з клюбу «Вясьнянка» (7 балаў з 9). Фармальна ён кандыдат у майстры, ды яго посьпех цяжка назваць сэнсацыяй: Уладзімер, чый рэйтынг вырас за пару гадоў амаль на 200 пунктаў, заваяваў тры балы міжнароднага майстра. Празарлівасьць менскага электрыка, не абдзеленага камбінацыйным зрокам, мы шматкроць выпрабавалі на сабе, сядаючы зь ім за «бліц».

**ВР**

### Як бы вы згулялі?

У.Куцанкоў — С.Міхайлоўскі. Менск, 2006. Ход белых.



**Адказ:** 1. d5! «Тут часта гуляюць 1. a3, але ход з партыі мае тактычнае абгрунтаваньне: 1…b4 2. dc bc 3. cd cb 4. dcФ baФ 5. Фd8 Td8 6. Фc2 і фэрзь a1 у пастцы», — патлумачыў У.К. Да дуэлі чатырох фэрзяў справа, аднак, не дайшла: замест 3…cb чорныя згулялі 3…Cb7 і пасьля 4. c5!? Ke4 (лепш было 4…Фd7) 5. cd Cf6 6. Cd3 у белых выявілася перавага.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Правансальскае віно па галівудзкіх рэцэптах

**«Добры год»** («Good Year»)

ЗША, 2006, каляровы, 118 хв.

**Жанр:** мэлядрама.

**Адзнака:** 6 (з 10).

Фінансавы махляр Макс Скінэр (Расэл Кроў) атрымлівае ў спадчыну ад памерлага дзядзькі вінаграднік у Правансе. Дзелавы Скінэр зьбіраецца прадаць сядзібу, але яго не адпускаюць дзіцячыя ўспаміны. А рамантычнае каханьне да мясцовае прыгажуні і наваднойдзеная сваячка ўзмацняюць ваганьні.

Тактоўная, далікатная й рамантычная стужка Рыдлі Скота. «Не ў грашах шчасьце!» — хаця яны таксама будуць. Герой стаіць перад выбарам: адмовіцца ад сваіх успамінаў, чалавечнасьці, ціхіх сямейных радасьцяў — ці паслаць к чорту апрыклую фінансавую калатнечу. Няцяжка здагадацца, якім будзе фінал, але зьдзіўляе, наколькі пасьлядоўна амэрыканскі фільм дыскрэдытуе сквапнае грашалюбства.

Такія стужкі называюць «жаночымі». Але, у адрозьненьне ад іншых жаночых фільмаў, сьлёзы, сьмех, жарты й драматычныя ўскладненьні падабраныя тут у неабходнай прапорцыі. Ляніва-густоўны Расэл Кроў — фінансавы мярзотнік, жартаўнік, закаханы; мудры дзядзька Альбэрт Фіні, правансальская дзяўчына з характарам — і прыгажуня-сястра.

Рамантычнае спатканьне ў адкрытым кінатэатры, дзе дэманструюцца мэлядрамы, — і дождж, як выпрабаваньне для закаханых; пацешны дзядок з правансальскім дыялектам і біржавыя інтрыгі.

Праблемы вырашаюцца амаль бесканфліктна, на стале чырвонае віно рэдкага гатунку… І ці настолькі важна, што правансальскае віно згатаваў амэрыканец па галівудзкіх рэцэптах?

**Андрэй Расінскі**

## ТЭАТРЫ

**опэра**

*На сцэне Цэнтральнага Дому Афіцэраў*

**8 (пт)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**9 (сб)** — «Царская нявеста».
**10 (ндз)** — «Кармэн».

**Купалаўскі тэатар**

**8 (пт)** — «Каханьне ў стылі барока».
**9 (сб)** — «Ромул Вялікі».
**10 (ндз)** — «С.В.».
**11 (пн)** — «Я не пакіну цябе...».
**16 (сб), 17 (ндз)** — «Макбэт».

*ранішнія спэктаклі*

**10 (ндз)** — «Сьнежная каралева».

*малая сцэна*

**7 (чц)** — «Адчыніце кантралёру!».
**11 (пн)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».

**Тэатар беларускай драматургіі**

*На сцэне РДК Прафсаюзаў*

**13 (ср)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі».
**15 (пт)** — «Адэль».

*Тэатар юнага гледача*

**8 (пт)** — «Якая стварыла цуд».
**8 (пт)** — «Залатое сэрцайка».
**9 (сб)** — «Пацалунак ночы».
**10 (ндз)** — «Залатое сэрцайка».
**10 (ндз)** — «Дзень народзінаў ката Леапольда».
**13 (ср)** — «Палачанка».
**14 (чц)** — «Рыцар Ордэна Сонца».
**15 (пт)** — «Марныя намаганьні каханьня».
**16 (сб)** — «Жураўлiныя пёры».

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 9 сьнежня

**НТВ, 14.00**

«Волга–Волга»

Расея, 1938, чорна–белы, рэж. Рыгор Аляксандраў

Музычная камэдыя

Самадзейныя акторы на чале зь лістаношай Стрэлкай адпраўляюцца ў Маскву — і сваімі сьпеўнымі нумарамі даводзяць да ручкі бюракрата Бывалава (Ігар Ільінскі).

Шчасьлівы маскульт сталінскіх часоў. Але таленавіта — і сьмешна.

**«Лад», 18.10**

«Фантамас разбушаваўся»

Францыя — Італія, 1965, рэж. Андрэ Юнэбэль

Чарговыя прыгоды інспэктара Жува, Фантамаса – і журналіста.

Ізноў геніяльныя Люі дэ Фюнэс і Жан Марэ.

**БТ, 19.10**

«Скрыжаваньні»

ЗША, 2002, рэж. Тамра Дэвіс

Моладзевая камэдыя

Тры сяброўкі, якія ня бачыліся з маленства, сустракаюцца зноў — і вандруюць па краіне. Падчас вандроўкі ім прыйдзецца наноў пазнаёміцца адна з адной і раскрыць важнасьць сяброўства, сям'і, вернасьці і каханьня.

Свае акторскія таленты ў гэтым фільме паспрабавала поп–зорка Брытні Сьпірс.

**СТВ, 20.15**

«Чырвоны цмок»

ЗША — Нямеччына, 2002, рэж. Брэт Ратнэр

Псыхапаталягічны трымценьнік паводле аднайменнага рамана Тома Гарыса

Канібальскі дэбют Ганібала Лектара. У фільме распавядаецца, як быў злоўлены легендарны душагуб. Як і ў «Маўчаньні ягнятак», сам Лектар выкарыстоўваецца, каб знайсьці маньяка па мянушцы «Зубная фэя».

Крывавы, трымценны й недаацэнены фільм.

Эндру Нортан — у ролі сьледчага, Ральф Файнз — маньяк і Энтані Гопкінз — Ганібал forever.

**БТ, 22.10**

«16 кварталаў»

ЗША, 2006, рэж. Рычард Донэр

Трымценьнік

Паліцэйскі мусіць даставіць сьведку ў суд – праз 16 небясьпечных кварталаў. Многія жадаюць, каб сьведка загінуў…

Рычард Донэр – прафэсійны аўтар страшнага кіно («Омэн»).

Ролі выконваюць: Брус Ўіліс, Мос Дэф.

**НТВ, 22.55**

«Чырвоны кут»

ЗША, 1997, рэж. Джон Эўнет

Дэтэктыўная драма

У Кітаі амэрыканскаму бізнэсоўцу падкідаюць забітую дзяўчыну. Героя абвінавачваюць у злачынстве… Пакуты аўтарытарнага суду, кашмар кітайскай турмы, напружанае дзеяньне.

Актуальнае кіно, хаця ў Беларусі не такія частыя гэпі–энды.

У трымценным дэтэктыве зьняліся Рычард Гір, Бай Лінг, Брэдлі Ўітфард.

### Нядзеля, 10 сьнежня

**БТ, 19.05**

«Мільён»

Вялікабрытанія – ЗША, 2004, рэж. Дэні Бойл

Сямейная камэдыя

Англія, 7 дзён да абмену фунту на эўра. Рабаўнікі крадуць мілён, але валізка з фунтамі трапляе да школьнікаў. Абмяняць грошы дзеці, вядома, ня могуць. Засталося растрынькаць іх за сем дзён…

**АНТ, 21.35**

«Гутарка з вампірам»

ЗША, 1994, рэж. Ніл Джордан

Вампірская драма паводле раману Эн Райс

Інфэрнальная гатычная гісторыя, якая адразу сталася клясыкай страшнага кіно. Журналісту дае інтэрвію вампір, які пражыў 200 гадоў. Вампір з чалавечай душой…

Гістарычныя шаты, касьцюмы, змрочная атмасфэра, нестандартны трохкутнік трох крывасмокаў – і звышбуйныя зоркі ў галоўных ролях.

У фільме граюць: Том Круз, Брэд Піт, Антоніё Бандэрас, Кірстэн Данст.

**БТ, 22.25**

«Павук»

Францыя – Канада – Вялікабрытанія, 2002, рэж. Дэйвід Кронэнбэрг

Драматычны трызьненьнік

Пасьля клінікі герой карціны па мянушцы Павук вяртаецца дадому. Старыя месцы выклікаюць у яго пакутлівыя дзіцячыя ўспаміны…

Пясьняр мутацый Дэйвід Кронэнбэрг зрабіў шэдэўр пра таямніцы чалавечай душы. Шызоідная драма – з геніяльнай акторскай ігрой Ральфа Файнза і Міранды Рычардсан (сыграла дзьве цалкам супрацьлеглыя ролі!).

**Андрэй Расінскі**

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.** Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перαказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў, зможа чытаць «НН» паўгоду.

# Дзякуй

**Аляксандру Ф., Ірыне М., Міколу П., В.В., Ю.В., В.П., А.Б., Івану Б., В.А., В.П., Уладзімеру К., М.Г., Марыі С., Пётру Т., Г.З., Віктару П., Натальлі Р., Сяргею С., Андрэю Ш., Міхаілу Ж., Сержуку Л., Ларысе Н., Дыяне П., Веры С., Юр'ю М., Мікалаю К., Андрэю К., Альбэрту С., Галіне Т., Людміле М., Юр'ю Б., Аляксандры Г.** зь Менску.

**Валерыі Х.** зь Дзяржынскага раёну.

**Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.

**Андрэю М.** з Новалукомлю.

**В.Д., Галіне Г., Іне С.** з Барысава.

**Міхаілу М.** з Стоўпцаў.

**Зьмітру К.** зь Віцебскага раёну.

**Кастусю З.** зь Віцебску.

**Г.** зь Менскага раёну.

**Мікалаю Н., Андрэю Л.** з Салігорску.

**Канстаціну К., Андрэю К., Аляксею К.** з Магілёва.

**Эльвіры Х., Рэгіне Г.** з Горадні.

**Віктару М.** з Баранавічаў.

**Інэсе З.** з Жыткавіцкага раёну.

**Сяргею П.** з Гомеля.

**У.Т.** з Маладэчна.

**Тацяне Х.** зь Пінску.

**Максіму К.** з Навагрудзкага раёну.

**Д.Д.** з Бабруйску.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: ____

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: ____

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць. На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

# калі б...



**...фатакар «Коммерсанта», здымкі якога Менск лічыць абразьлівымі, хацеў бы рэабілітавацца.**

— Мяркую, мае апошнія фоты не выклікаюць у вас пратэстаў?



**...рэалізавалася б пагроза Чаргінца аблегчыць транзыт хворых на СНІД у краіны Эўразьвязу праз Беларусь у адказ на адмену прэфэрэнцый.**



**...спэцслужбы выкарысталі гісторыю з атручэньнем Літвіненкі.**

Дыктар: «Спачатку мы думалі, што знайшлі ў машыне Анжалікі Борыс амфэтаміны, потым — гераін. Аднак натуральна, што палякі цягаюць з сабою палёний–206».

МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЁЛІКА УШКІНА

# Сабачыя гісторыі

Адзін Сабака трапіў у танк. А там Граждан пілуе снарад: «Тут золата хопіць і на дзеда Мазая з зайцамі...»

* * *

Адзін Сабака паставіў усіх перад фактам. Граждан, даведаўшыся пра гэта, сказаў: «Як бананы лопаць, дык усе здаровыя, а як нюхаць клей, дык мама яшчэ не дазваляе...»

* * *

Адзін Сабака зайшоў у мэтро. Граждан забег сьледам і закрычэў: «Хопіць катацца, пара ўжо для Шніперзона вагоны з кукурузай разгружаць!..»

* * *

Адзін Сабака з прыкметамі атручэньня трапіў у больніцу. Граждан зьдзівіўся: «А ў мяне кожны дзень панос, і я чуствую пячонкай, што мне давядзецца стаць улюблёным у гэту рэвалюцыйную жызь...»

* * *

Адзін Сабака, даведаўшыся, што ў «Нашай Нівы» хутка будзе іншы галоўны рэдактар, выпіў і закусіў удзяла. Граждан, даведаўшыся пра перамены ў рэдакцыі, абрадаваўся: «Цяпер мяне точна не пасадзяць за буракі, якія я спас у мінулым годзе ад галоднай сьмерці...»

* * *

У аднаго Сабакі быў добры настрой, і ён сьпяваў. Граждан, пачуўшы сабачыя песьні, раззлаваўся: «Давядзецца і яму морду набіць, бо такі Павароці ня можа ўкрашаць зону майго аб'яданьня на кісламалочнай глебе...»

* * *

Адзін Сабака сказаў: «Я не забіваў вашага дзіка!..» Пачуўшы гэта, Граждан загадаў ачысьціць лес ад вожыкаў у тумане і грузьдзёў у сьмятане...

**SG**

## У НУМАРЫ



### Наступнікам Пуціна будзе праваслаўны кагэбіст

Партрэт кіраўніка Расейскай чыгункі.
**Старонка 13.**



### Вершы пра Плошчу

Эмацыйнае падарожжа ў тыя дні, калі сэйсмографы паэтычных душаў зашкальвала.
**Старонка 11.**



### Фафудзьдзя

Украінскі Інтэрнэт захапляецца гульнёй у «фафудзьдзю», паводле папулярнасьці параўнальнай з расейскім «мядзьведам».
**Старонка 22.**

## ЖАРТ



## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Багачы, памешчыкі ды фабрыканты ня вельмі церпяць бяду ды гора ад цяперашніх парадкаў; найгорш жывецца працуючаму народу, таму народу, што апроч сваіх рук да працы нічога ня мае. Дзеля таго найлепшымі, найсьмялейшымі байцамі ў Думе за новыя парадкі будуць тыя людзі, каторых працуючы народ выбера спамеж сябе або спамеж сваіх шчырых, праўдзівых і верных прыяцеляў, што для яго працавалі і цярпелі за справу народную.

**«Наша Ніва». 1906. №3**

## А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 30.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАНТАКТЫ

**Зьміцер Дашкевіч**, трымайся! Бог цябе любіць. IV Царстваў 6:16! Брат

**Беларускіх патрыётаў** і хрысьціянаў запрашаем наведаць сайт БХД www.bchd.info або пісаць: а/с 290, 220109, Менск. П.Севярынец

### ПАКОЙ

**Здыму пакой** у адэкватных людзей за разумны кошт. Разглядаю ўсе іншыя варыянты жытла ў Менску. Плачу спраўна. Т.: 685-52-39. Сяржук

### ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў сяброўскае падарожжа 17 сьнежня (нядзеля) па маршруце: Менск—Крывічы—Будслаў—Княгінін—Касьцяневічы—Куранец—Вязынь—Краснае—Менск.
23—24 сьнежня: Вільня—Коўна—Рушышкі.
Т.: 292-54-58, 622-57-20, 110-19-28, 509-12-16, 573-88-17

### ПРАЦА

**Шукаю** адміністратара для працы з сайтам. Т.: 771-49-39. Алесь

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2671. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 29.11.2006.
Замова № 6802.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.